# КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 27 (1257) 2 ліпеня 2016 г.


# 3 ЛІПЕНЯ — ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Напярэдадні Дня Незалежнасці мінчан і гасцей сталіцы чакае "Дзень вышыванкі", які можа стаць традыцыйным. Праект, арганізаваны Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам і Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі, стартуе сёння каля Палаца спорту. Сімвалічна, што менавіта ў Год культуры "нарадзілася" свята, прысвечанае вышытаму нацыянальнаму арнаменту.**

Вольга РОПАТ

Мерапрыемства пачнецца апоўдні, калі на пляцоўцы будуць прадстаўлены вырабы майстроў народных рамёстваў і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Таксама ў наведвальнікаў з'явіцца магчымасць прыняць удзел у майстар-класах. Але ўвесь маштаб свята адчуецца а 14-й — афіцыйная частка пачнецца арт-парадам "Пад сцягам у вышыванках", удзельнікі якога — фальклорныя калектывы, духавыя і інструментальныя аркестры, тэатры, танцавальныя школы. Настрой наведвальнікам падораць гурт "Правакацыя", арт-гурт "Беларусы", заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Іна Афанасьева, Алена Ланская, Вікторыя Алешка, Жанэт, спявак Яўген Ермалковіч і многія іншыя артысты…

Падчас мерапрыемства пройдзе акцыя "Гэта наша" — наведвальнікам будуць раздаваць стужачкі з нацыянальным арнаментам. Да ўсяго, ахвотныя змогуць прыняць удзел у стварэнні калектыўнага пано. Пройдзе ўзнагароджанне пераможцаў фотаконкурсу "Сэлфі і фота ў вышыванцы" — аматарскія і прафесійныя фатаграфіі можна пабачыць у сацыяльных сетках.

Асаблівасць свята "Дзень вышыванкі" ў спалучэнні традыцыйнасці і сучаснасці. Так, упрыгожваць наведвальнікаў арнаментальным узорам будзе бодзі-арт-салон, а беларускія дызайнеры і вытворцы прадставяць калекцыі з элементамі вышыўкі. З'явіўся "Дзень вышыванкі" невыпадкова: не першы год трымаецца тэндэнцыя на арнаментыку ў адзенні, аксэсуарах, а больш смелая моладзь нават робіць тату ў выглядзе бранзалетаў…

Чаго яшчэ чакаюць ад свята? Рыцарскі турнір, народныя гульні і конкурсы, інтэрактыўная экспазіцыя "Фольк-кірмаш" творцаў са сталіцы і абласцей. Працягнецца дзея канцэртнай праграмай "Арт-фолк" — прагучаць некалькі кампазіцый у выкананні Беларускага дзяржаўнага ансамбля "Песняры", Беларускага дзяржаўнага Заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі", заслужанай артысткі Рэспублікі Беларусь Ірыны Дарафеевай, гуртоў "ВуСІТУ", "Дразды", Іскуі Абалян і шоу-балета "Прайд" ды іншых… Скончыцца Дзень вышыванка маладзёжнай дыскатэкай "Вышыванка.by" і конкурсам "Бітва дзі-джэяў".

Сёння мінчан і гасцей сталіцы чакае першы "Дзень вышыванкі", народжаны ў Год культуры. Беларусы адгукнуліся на заклік выкладваць свае фота ў вышыванках з адпаведным хэштэгам ў сацыяльных сетках. Ну а носьбітам моды на вышываныя рэчы і аксэсуары ў публічнай прасторы цягам апошніх месяцаў стаў беларускі ўдзельнік на Міжнародным конкурсе маладых выканаўцаў "Славянская базару ў Віцебску" Аляксей Грос. Глядзіце, ён і на гэтым фота ў вышымайцы!

# Мастацтва душэўнай раўнавагі

**Калі хочаш мець уяўленне пра эканамічны стан краіны і дабрабыт — наведай крамы і рынкі. А вось калі інтарэс больш глыбокі, калі ёсць намер зазірнуць у душу народа і напоўніць канкрэтным зместам паняцце "нацыянальны менталітэт", трэба ісці ў тэатр і мастацкі музей. Сёлета Рэспубліцы Беларусь — 25 год. Маючы трывалы гістарычны грунт і глыбокія цывілізацыйныя карані, наша краіна годна прайшла выпрабаванні і сцвердзілася як паўнавартасная, суверэнная дзяржава. Выстава "Сучасная Беларусь вачыма мастакоў", што праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі, распавядае пра тое, як згаданая чвэрць стагоддзя адбілася ў люстэрку творчасці.**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Выстава займае галерэю музея. Адкрываецца яна вядомай карцінай Мая Данцыга "Мой Мінск". Беручы да ўвагі час стварэння — 1967 год, можна палічыць, што яна наўрад ці можа ўвасабляць сучасную Беларусь. Але насамрэч Данцыг намаляваў не так канкрэтны краявід, хоць кожны мінчанін лёгка пазнае гэтае месца, а вобраз горада, звернуты да будучыні. Мінск на ягоным палатне ўжо тады паўстае мегаполісам з магутнай дынамікай. Закладзены ў тыя гады патэнцыял нашай сталіцы атрымаў развіццё ўжо ў суверэннай дзяржаве.

Годна прадстаўлены ў экспазіцыі і іншыя мастакі старэйшага пакалення — Аляксандр Кішчанка, Зоя Літвінава, Міхась Рагалевіч, Барыс Казакоў… Для той эпохі, якая скончылася ў 1991 годзе, іх творчасць была не заўжды прымальнай, бо выразна выбівалася з афіцыйна ўхваленай плыні, але на канцэптуальным узроўні аказалася вельмі жыццядайнай і запатрабаванай ужо ў наступным часе. Так што іншы раз хочацца параіць маладым мастакам, псіхалагічна скіраваным на модныя і, нібыта, актуальныя плыні, азірнуцца на досвед сваіх папярэднікаў, якія не баяліся быць самімі сабой. Дарэчы, арганізатары выставы не сталі падзяляць мастакоў на тых, хто ўжо ўсё сказаў і належыць вечнасці, і тых, хто сёння бярэ чынны ўдзел у культурным працэсе. Бо ў экспазіцыі ўвага акцэнтуецца не на асобах і іх лёсах, а на творах і з'явах, якія сёння вызначаюць аблічча нашага арт-працэсу.

Пры ўсёй шматаблічнасці выяўленчага мастацтва Беларусі рэй у ім па-ранейшаму вядуць творцы, якія абапіраюцца на базавыя каштоўнасці рэалістычнай школы. Таму цалкам лагічным падаецца прысутнасць у экспазіцыі карцін Уладзіміра Тоўсціка і Уладзіміра Кожуха. Гэтым майстрам не ўласцівыя стылёвыя і эсэвыя хістанні. Кожны з іх глыбока і мэтанакіравана распрацоўвае пэўнае кола тэм і сюжэтаў. Гэта сітуацыя, калі сюжэтаў няшмат, а духоўная прастора — велізарная. У нейкай ступені гэта меркаванне можна аднесці і да Аляксандра Грышкевіча, Андрэя Задорына, Валерыя Шкарубы.

Сёння да ліку класікаў нацыянальнай культуры далучаны Уладзімір Цэслер, які прыйшоў у выяўленчае мастацтва з дызайну і прыўнёс у жывапіс спецыфічнае бачанне рэчаў і з'яў, уласцівае прадстаўнікам ягонага творчага цэху. Сяргей Цімохаў, маючы цудоўную школу рэалістычнага мастацтва, у сваёй творчасці знайшоў раўнавагу паміж рэалізмам і містыкай, фігуратыўнасцю і абстракцыяй. У значнай ступені дзякуючы яму тэма дахрысціянскай міфалогіі нашай зямлі набыла шмат прыхільнікаў сярод інтэлектуалаў і людзей творчых прафесій. Ён здолеў паяднаць у сваіх карцінах досвед язычніцкага абстрактнага мыслення і абстрактнага ж мастацтва XX стагоддзя.

Заканчэнне — **на старонцы 9.**

Актуальна

# Навацыі кодэксу

**24 чэрвеня дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны прынялі ў другім чытанні праект Кодэкса Беларусі аб культуры. А 30 чэрвеня дакумент быў ухвалены ў Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Як адзначыла "К" намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталля Кучынская, у прынятым Кодэксе аб культуры змяшчаецца шэраг навацый.

— Па-першае, адзначу ўключэнне ў праект Кодэкса аб культуры нормаў новага акта Прэзідэнта — Указа ад 14 снежня 2015 года № 485 "Аб удасканаленні аховы археалагічных аб'ектаў і археалагічных артэфактаў", — адзначыла Наталля Кучынская. — Згодна з праектам Кодэкса прадугледжваецца стварэнне пры аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме так званых археалагічных камісій (камісій па археалагічных аб'ектах і археалагічных артэфактах), якія будуць прымаць рашэнне аб аднясенні выпадкова выяўленага матэрыяльнага аб'екта да археалагічнага аб'екта або археалагічнага артэфакта.

Таксама Кодэксам замацоўваецца абавязковасць перадачы ў дзяржаўную ўласнасць прафесійна і выпадкова выяўленых археалагічных артэфактаў ды забараняецца грамадзянскі абарот археалагічных артэфактаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем выпадкаў, вызначаных праектам Кодэкса. Што да ажыццяўлення пошуку археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў з выкарыстаннем металашукальнікаў, геарадараў, іншых тэхнічных сродкаў і інструментаў, дык ён дазваляецца толькі асобам, на імя якіх Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі выдадзены дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў.

— Па-другое, у праект Кодэкса ўключаны палажэнні Законаў аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве (артыкул 16), аб альтэрнатыўнай службе (артыкул 164), аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці (артыкул 116), — зазначыла Наталля Кучынская. — Акрамя таго, у сувязі з заканчэннем тэрміну прыватызацыі з праекта Кодэкса выключаны палажэнні, якія датычаць суб'ектаў прыватызацыі жылога памяшкання, якому нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Так, адбылася карэкцыя тэрмінаў і ўмоў вяртання ўваходных білетаў (па ініцыятыве грамадзяніна — за 1 каляндарны дзень), а таксама тэрміну, у які арганізатар мае права адмовіцца ад правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства (1 каляндарны дзень); прадугледжваецца магчымасць вяртання ўваходных білетаў у выпадку змянення складу ўдзельнікаў ці змянення месца і часу правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства (не пазней за сем каляндарных дзён з дня падачы заявы выплачваецца кампенсацыя кошту білета ў поўным памеры); пашыраны пералік падстаў для адмовы ў выдачы пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (за парушэнне тэрміну выплаты кампенсацыі пры адмене мерапрыемства, па заключэнні мастацкага савета па культурна-відовішчных мерапрыемствах аб нізкім мастацкім узроўні, пры падачы падложных або несапраўдных дакументаў).

Заканчэнне — **на старонцы 2.**

Актуальна

# Навацыі кодэксу

*(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)*

Кодэксам прадугледжваюцца новыя працэдуры: выдача дубліката прафесійнага сертыфіката творчага работніка ў выпадку яго страты, узгадненне Міністэрствам культуры навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях; выдача дазволу на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях.

— Акрамя таго, многія палажэнні праекта Кодэкса па іншых пытаннях перагледжаны і ўдакладнены, — паведаміла Кучынская. — Так, Кодэкс дапоўнены новымі артыкуламі: аб недапушчэнні пагаршэння ўмоў утрымання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Вызначаюцца патрабаванні да размяшчэння на тэрыторыі нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і ў гэтых зонах аховы нестацыянарных аб'ектаў гандлю і нестацыянарных аб'ектаў грамадскага харчавання, а таксама размяшчэння сродкаў вонкавай рэкламы; аб прыняцці ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы.

У параўнанні з дзейсным законам аб музеях і музейным фондзе ў праекце прадугледжаны больш сур'ёзныя патрабаванні да стварэння музеяў (абавязковае патрабаванне — магчымасць увядзення штатнай адзінкі (адзінак) музейнага работніка), спрашчаецца парадак стварэння музеяў-запаведнікаў і музеяў пад адкрытым небам (не патрабуецца прыняцця рашэнняў Прэзідэнта Беларусі або Савета Міністраў краіны). Таксама ў адрозненне ад дзейснага закона аб народнай творчасці, народных промыслах (рамёствах) да вырабаў народных мастацкіх рамёстваў можа быць аднесена прадукцыя не толькі індывідуальных прадпрымальнікаў, рамеснікаў і арганізацый народных мастацкіх рамёстваў, але і іншых юрыдычных асоб, і ім таксама можа аказвацца падтрымка.

Кодэксам уводзіцца паняцце цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў і даецца яго вызначэнне (гэта культурныя мерапрыемствы, якія праводзяцца па рашэнні дзяржаўных органаў і поўнасцю або часткова фінансуюцца з рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, артыкул 209), што адпавядае практыцы фінансавання культурных мерапрыемстваў. Да слова, да культурнай дзейнасці аднесена аказанне метадычнай дапамогі суб'ектам культурнай дзейнасці. Акрамя таго, Кодэксам удакладнена кампетэнцыя Міністэрства культуры па каардынацыі дзейнасці мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў абласнога і базавага тэрытарыяльных узроўняў (ажыццяўляецца на практыцы), а таксама падрыхтоўцы (перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі) педагагічных работнікаў устаноў адукацыі ў сферы культуры. К

Фотафакт

## "Беларусь, я люблю цябе!"

Працягваюцца мерапрыемствы рэспубліканскай акцыі "Беларусь, я люблю цябе!". Пасля этапаў ля сталічнай Ратушы і ў гандлёвым цэнтры "Сталіца" ў Дзень Незалежнасці Беларусі яна запануе на ўрачыстасцях ля стэлы "Мінск — горад-герой".

**На здымку: адзін з канцэртаў у рамках акцыі ў ГЦ "Сталіца".**

**Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ**

Газета КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)

Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Галоўны рэдактар** — Сяргей Сяргееві ч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **агляданьнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддрэс: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выравец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.** Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2016. Наклад 4 407. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 1.07.2016 у 21.00. Замова 2679. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Ёсць пытанні!

**Навуковы супрацоўнік знакамітага Дзяржаўнага Эрмітажа Аляксандр Гордзін ужо не першы год імкнецца змяніць да лепшага лёс закінутай Пакроўскай царквы ў вёсцы Стайкі, што ў Невельскім раёне на расійскай Пскоўшчыне. Але… пакуль што безвынікова. І нядаўні яго ліст у "К" без усякага пафасу можна назваць "крыкам душы": каштоўны архітэктурны помнік гіне літаральна на вачах. Яшчэ год-два, і ратаваць ужо проста не будзе чаго. Царква мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці рэгіянальнага значэння, але ж на яе стане ён не адбіўся.**

# "Анклаў" спадчыны і стыхія

Ілья СВІРЫН

Называючы гэты храм помнікам менавіта беларускага дойлідства, адрасант не памыляецца. Пра тое сведчаць і першапачатковая канфесійная прыналежнасць, і архітэктурныя асаблівасці. Царква была збудаваная ў XVIII стагоддзі як грэка-каталіцкая. Стылістыка адпаведная — сплаў чыста народных уяўленняў пра харастро з тагачаснымі агульнаеўрапейскімі трэндамі: барока і класіцызмам. Нягледзячы на перабудовы, храм не страціў гэтых сваіх асаблівасцяў і ў далейшым — у адрозненне ад многіх іншых. Больш за тое — ацалеў і ўнікальны алтарны жывапіс.

Што праўда, час бярэ сваё. Лёс храма ў савецкія часы склаўся даволі тыпова. Спярша там размясцілі калгасны склад, а потым яго і наогул закінулі. І вось дах ужо абрынуўся, барочных вежак на фасадзе больш не пабачыш, спалучаны менавіта з беларускай гісторыяй, апынуўся на тэрыторыі суседняй дзяржавы, няма нічога дзіўнага — асабліва калі ўлічыць, што ад мяжы яго аддзяляе ўсяго пару кіламетраў. Тым больш, ёсць і куды цікавейшыя прыклады "анклаваў спадчыны": скажам, драўляная стараабрадніцкая царква ва ўрочышчы Стрыпішкі, што ў Астравецкім раёне, на самай мяжы з Літвой. Гэты помнік рускай духоўнай культуры сёння таксама занядбаны ды вырачаны на знікненне.

Адпаведна, сам сабою вымалёўваецца прыгожы і сімвалічны праект, здатны падкрэсліць і геаграфічную, і гістарычную повязь двух народаў: сумеснымі намаганнямі выратаваць гэтыя дзве царквы. Прычым "пацягнуць" яго, як падаецца, магчыма не толькі на міждзяржаўным, але і на муніцыпальным узроўні. На нядаўнім Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі шмат гаварылася пра неабходнасць наладжвання менавіта гарызантальнага супрацоўніцтва.

Вядома, хочацца верыць, што ўзнёслыя словы перапрацоўваюцца ў справы. Але зважаючы на цяперашні стан царквы, чакаць гэтага ўжо не выпадае — проста няма куды. Як вынікае з ліста, Аляксандр Гордзін усё больш разлічвае на грамадскую ініцыятыву. Якія ж захады належыць зрабіць у гэтым выпадку?

— Перш-наперш неабходна выканаць дакладныя абмеры помніка, прывязку на мясцовасці, дэталёвую фотафіксацыю, — перакананы Антон Астаповіч. — І калі, барані божа, храм уратаваць не ўдасца, яго можна будзе некалі рэканструіраваць у аўтэнтычным абліччы. Драўлянае дойлідства — у прынцыпе аднаўляльнае.

Паводле падлікаў, для першачарговых работ па кансервацыі храма патрэбна ўсяго каля 50 тысяч расійскіх рублёў — альбо паўтары тысячы дэнамінаваных беларускіх. Сума зусім невялікая. Як падаецца, яе можна было б сабраць "усім мірам".

— Па шчырасці, я стаўлюся да такой перспектывы трохі скептычна, — Антон Астаповіч згадвае тыя гучныя кампаніі па зборы сродкаў, якія прынеслі мізэрныя вынікі. — Але калі ўсур'ёз узяцца за справу, можа, нешта і атрымаецца. Тут вельмі важны менавіта арганізацыйны, чалавечы фактар.

Як кажуць, новае — гэта забытае старое, але пададзенае з належным піярам. Вось і цяпер на змену атавістычным "дабрачынным рахункам" прыходзяць краўдфандынгавыя платформы, якія і ў нас і ў Расіі ўжо ў асартыменце. Здаецца, ужо назапасілася нямала праектаў, якія атрымалі дзякуючы ім шлях у жыццё. А галоўная ўмова іх поспеху — добрая рэклама — таксама дасягалася на грамадскіх пачатках: праз шматлікія рэпосты ў сацыяльных сетках.

Да ўсяго, пэўныя работы па кансервацыі можна выканаць і на валанцёрскіх пачатках. Вядома ж, гэта таксама запатрабуе пэўных арганізацыйных высілкаў, і для адной асобы яны могуць быць занадта вялікія. Але калі раскруціць махавік супольнымі намаганнямі…

У Расіі ёсць грамадскія таварыствы, якія займаюцца аховай спадчыны. У саміх Стайках існуе праваслаўны прыход. Ён занадта малы для таго, каб адужаць рэстаўрацыю сваімі сіламі, але, напэўна, усё ж здатны пасільна дапамагчы — скажам, размясціць-накарміць валанцёраў. Урэшце, можна разлічваць і на дапамогу з Беларусі.

— Захаванне гэтага помніка спадчыны не можа нас не хваляваць, — кажа Антон Астаповіч. — На жаль, рэсурсы нашы абмежаваныя — і фінансавыя, і часавыя, бо да канца года ўжо літаральна кожная хвіліна распісана. Але, нягледзячы ні на што, папрасіў бы Аляксандра Гордзіна са мной звязацца. Разам што-небудзь прыдумаем. К

**На тыдні інтэрнэт абляцеў здымак: сербскія музыканты выступаюць ля сталічнай Ратушы перад пустой плошчай. Ёсць варыянт з іншага ракурсу, але плошча пустая.**

# Адкуль "мёртвая зона"?

Настасся ПАНКРАТАВА

Канцэрт быў запланаваны ў рамках Дзён Бялграда ў Мінску. Можна колькі заўгодна распавядаць пра нязручны час для канцэрта, спёку і працоўны дзень, але ж лета, многія мінчане ў адпачынках, стае і турыстаў, якія маглі б падысці паслухаць замежных выканаўцаў. Каб ведалі пра іх выступленне…

Спецыяльна пагартала стужку навін за тыдзень: сятая інфармацыя пра Дні Бялграда ў сталіцы знаходзіцца, але ўся яна тычыцца афіцыйнай часткі мерапрыемстваў. Дзелавы візіт сербскай дэлегацыі, перамовы старшыні Мінгарвыканкама Андрэя Шорца з мэрам Бялграда Сінішай Малі, адкрыццё бізнес-цэнтра, а таксама выставы Ніколы Тэсла і турніра па шахматах у Ратушы — і ні слоўца пра культурную праграму і музычныя мерапрыемствы. Можа, разлічвалі, што мінакоў будзе дастаткова? Мне ж падаецца, трэба было засяродзіць увагу на падзеі, каб людзі задумаліся, а ці не завярнуць ім адмыслова на тую плошчу Свабоды. А як здагадацца, што ў некалькіх сотнях метраў нешта адбываецца?

Гэты "няёмкі" кадр Вольгі Сталяровай з яе старонкі ў "Facebook" і выклікаў шквал абурэння мінчан.

Гэты выпадак — не адзіны, калі інфармацыі пра выступленні ў рамках Дзён культуры іншых краін альбо пра айчынныя культурныя мерапрыемствы, арганізаваныя з удзелам дзяржструктур, амаль не было. Здавалася б, сёння кожны ведае, што ў канцэрцыю любой імпрэзы павінны закладвацца такі складнік, як рэклама, але я сама колькі разоў натыкалася ў банер мерапрыемства (фестываль армянскай культуры, Дня Расіі і гэтак далей) ужо на самой пляцоўцы, дзе і так ужо ўсё зразумела…. Можа, лепш хаця б па адным штэндары (пластыкавым шчыце) размясціць у людных месцах, напрыклад, на прахадных вуліцах хаця б за тыдзень? Сапраўды, падыход "праінфармуем напярэдадні" — проста выдае дылетанцтвам. Але так яно і дзеецца, як правіла...

На жаль, часткай работнікаў культуры і чыноўнікаў PR-тэхналогіі дагэтуль не ўспрымаюцца патрэбным фактарам у прасоўванні свайго прадукту, у тым ліку канцэртных мерапрыемстваў. А потым толькі рукамі разводзяць, бачачы пустую залу… У гэтай сувязі ўжо не такім дзіўным выглядае выбар месца правядзення рэспубліканскай акцыі "Беларусь, я люблю цябе", што прымеркавана Міністэрствам культуры да Года культуры. Падземны гандлёвы цэнтр "Сталіца" не назавеш мёртвай зонай — выступленні заўсёды будуць мець гледачоў, хаця б і з ліку выпадковых пакупнікоў. Урэшце, тое спрацавала сапраўды, а на апошніх канцэртах студэнтаў і навучэнцаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных устаноў прыходзілі "па завядзёнцы". А вось пад канец адкрыцця яе на плошчы Свабоды было, мякка кажучы, не шматлюдна. Чаму? Бракавала масіўнай (і не за два дні) папярэдняй рэкламы.

Асабліва шкада гляздзець на здымак з адзінокімі сербскімі музыкантамі перад пустэчай плошчы, ведаючы, што мінчане любяць огэн-эйры і горача іх падтрымліваюць! Падчас "Джазавых вечароў ля Ратушы" ці іншых вялікіх імпрэз назіраем натоўп. Многія меламаны прыходзяць з турыстычнымі дыванкамі ці сідушкамі, а некаторыя нават з паходнымі крэсламі, у залежнасці ад надвор'я захутваюцца ў коўдры ці бяруць вееры. У чым сакрэт масавасці? У рэкламнай хвалі, што прайшлася і ў мас-медыя, і ў сацыяльных сетках, і ў метро. Карацей, рэкламуйце сябе! І да культуры пацягнуцца. К

# Манеты ёсць ужо, а скарбонкі толькі будуць...

**"Грашовыя" дрэвы, скарбонкі ў выглядзе парася ці сабакі, карціны з манет і дзясяткі самых розных сувеніраў. На ўсё гэта цягам самага бліжэйшага часу попыт павялічыцца. Прычына з'явы адна: сёлетняя дэнамінацыя. Але ці падрыхтаваліся, скажам, раённыя Дамы рамёстваў да гэтай падзеі? Ці чакаюць збольшага вырабы "made in China"?**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Напрыклад, ці ёсць у айчынных РДР цікавыя вырабы-скарбонкі, якія можна за не надта вялікую суму набыць для хатняга ўжытку? Як я даведаўся, на адным з раскручаных сайтаў сёння прапануюць набыць скарбонкі ў выглядзе парасяці, кракадзіла, вялізнай гіры, мішкі, малпачкі, скрынкі і нават бонды. Каштуюць такія рэчы па-рознаму — ад 4 да 62 дэнамінаваных рублёў. Ёсць, напрыклад, і смешны кот-байкер за 107 рублёў. Ці ж змогуць ім скласці канкурэнцыю народныя майстры ва ўстановах культуры?

Так, па словах дырэктара Ганцавіцкага раённага дома рамёстваў Маргарыты Саланевіч, яны пастаянна робяць пад замову невялічкія партманэ, скарбонкі, розныя сувеніры, у тым ліку і пад выкарыстанне манет. Але асноўныя і самыя запатрабаваныя ў наведвальнікаў рэчы — гэта блузкі і вышымайкі. Каштуюць яны прыкладна 50 новых рублёў і карыстаюцца нязменным попытам. Пра ўкараненне скарбонак для манет у вытворчасць майстроў сваёй установы культуры Маргарыта Саланевіч ужо задумалася.

Яшчэ адзін кіраўнік падобнай установы культуры — Антопальская раённага цэнтра рамёстваў Драгічынскага раёна Галіна Сцепанюк — распавяла "К", што драўляныя скарбонкі ў іх стала ёсць у продажы, але сёлета яны карыстаюцца вялікім попытам, і таму іх хутка раскупляюць. Прычым кошт падобнай скарбонкі цалкам дэмакратычны — у межах 5 дэнамінаваных рублёў. "Я лічу, што лепш зрабіць сувенірную рэч недарагой, каб яе хутка прадаць, — кажа Галіна Сцепанюк. — Гэта мая нязменная пазіцыя. І тое, што мы без асаблівых цяжкасцяў выконваем план платных паслуг у 25 мільёнаў старых рублёў на год, сведчыць, што я не памыляюся".

У сваю чаргу, дырэктар Гарадоцкага раённага дома рамёстваў і фальклору Марына Гушча лічыць, што ў сённяшніх умовах варта абавязкова ўлічваць кан'юнктуру рынку, запыты пакупнікоў і, канечне, не стаяць на месцы, а развівацца. "Менавіта з гэтай прычыны мы найбліжэйшым часам распачнём выраб грашовых скарбонак для манет з гліны, — кажа візаві. — Бо гэта абавязкова будзе запатрабавана нашымі наведвальнікамі. Ды і план платных паслуг, натуральна, трэба выконваць. А ён у нас даволі вялікі — больш за 30 мільёнаў "далітпеньскіх" рублёў".

Як бачна, пакуль Дамы рамёстваў — прынамсі, тыя, у якія я звярнуўся, — не прэзентуюць у сваіх калекцыях сотні сувеніраў на манетную тэматыку. І гэта нягледзячы на тое, што кіраўнікі ўстаноў культуры ведаюць пра запатрабаванасць тых жа партманэ ды скарбонак у пакупнікоў. Але відавочна, у хуткім часе такія сувеніры стала "прапішуцца" на паліцах салонаў-крамаў у айчынных РДР — гэтага запатрабуе ад майстроў само жыццё. І зменлівы рынак.

Напрыканцы дадам, што толькі ў Гарадку на Віцебшчыне мяне парадавалі тым, што пры іхняй установе культуры існуе салон-крама "Ля Парнаса". Многія ж дамы рамёстваў працуюць з пакупнікамі толькі пад замову або распрадаюць свае вырабы на кірмашах і святочных раённых імпрэзах. Між тым, "К" ужо колькі гадоў піша пра тое, што РДР без салона-крамы — гэта не ўчарашні, а нават пазаўчарашні дзень. Але, як бачна, воз і дагэтуль там. Вынікае, што адсутнасць кропак па продажы сувенірнай прадукцыі так і застаецца праблемай для айчынных раённых дамоў рамёстваў. І пісаць пра гэта журналістам "К" і іншых рэспубліканскіх СМІ давядзецца яшчэ доўга. Нягледзячы на сённяшнюю канкурэнцыю сярод майстроў народнай творчасці і кан'юнктуру рынку, пра якую ведаюць усе і ўсюды... К

## Будзем на сувязі!

**Паважаныя чытачы!**

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by. **Тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97.

**Абмяркоўвайце** на **facebook.com/kimpressby vk.com/kimpressby, twitter.com/kimpressby, instagram.com/kimpressby**

## СТРАТЫ

### Расціслаў Янкоўскі (1930 — 2016)



Памёр народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі, які ледзь не шэсцьдесят гадоў запар выходзіў на сцэну Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага. Такім і запомніўся — з усё нарастальнай славай, "запраграмаванай" у ягоным імені, і вечнай маладосцю душы, закладзенай у адно з самых "артыстычных", калі меркаваць па агромністай акцёрскай дынастыі, прозвішчаў.

У тэатры і кіно ён сыграў каля 220-ці роляў — а значыць, пражыў і столькі ж жыццяў. Але ўсё роўна мала! Бо талент немагчыма вымяраць колькасцю: колькі б роляў ні склалася, заўсёды будзе замала. І фантазіі ўдзячных гледачоў будуць падкідваць магчымыя пераўвасабленні любімага артыста, якім, на жаль, ужо не здзейсніцца.

Старэйшы з трох братоў, кожны з якіх таксама пайшоў па тэатральнай сцежцы, ён быццам пракладаў шлях і ім, і далейшым пакаленням сваёй вялікай тэатральнай сям'і. А ў тэатры імя Горкага, які таксама быў яго вялізнай сям'ёй, заставаўся прыкладам і вышэйшага майстэрства, і такога ж высокага стаўлення да сваёй прафесіі.

Сярод апошніх па часе тэатральных прэм'ер у яго быў спектакль з больш чым сімвалічнай назвай — "Вечнасць на дваіх". І хаця пастаноўка была зусім пра іншае, схаваны сэнс той назвы выявіўся праз некалькі гадзін пасля смерці Расціслава Іванавіча: увечары таго ж дня пайшоў з жыцця яшчэ адзін з "апошніх магіканаў" — кампазітар Сяргей Картэс. Можа, усё дзеля таго, каб яны сустрэліся за той мяжой — і стварылі яшчэ не адзін музычна-тэатральны шэдэўр, але ўжо разам?

Гісторыя, здараецца, падкідвае нам загадкі, канчаткова разгадаць якія не давядзецца, мабыць, нікому. Так і з гэтымі двума пахаваннямі ў адзін дзень.

Ды ўсё ж самай, бадай, сімвалічнай для гісторыі нашай нацыянальнай культуры была роля Расціслава Янкоўскага ў спектаклі "Пане Каханку": ён іграў Караля Станіслава Радзівіла, укладаючы не проста ў ягоныя вусны (гэта зрабіў ужо драматург Андрэй Курэйчык), але і ў ягонае сэрца глыбокі роздум пра нацыянальнае самавызначэнне беларусаў.

Ён і сам паводле ўсёй сваёй постаці быў сімвалам беларускай шляхты — нягледзячы на адэскае паходжанне і таджыкскае месца вучобы, а менавіта, у студыі пра Ленінабадскім драматычным тэатры. Шляхетны артыст — у гэтым азначэнні ўласна паходжанне не галоўнае. Бо справа найперш у згаданым самавызначэнні, самапачуванні — і адчуванні сваёй унутранай годнасці, гонару, праўды, справядлівасці, умення быць непахісным, адстойваючы сваю пазіцыю.

Безліч узнагарод, прэмій, прызоў — гэта хіба знешні паказальнік паспяховасці. Куды больш дакладным вымярэннем можа лічыцца папраўдзе бязмежную любоў гледачоў. Менавіта яна не дазволіць Расціславу Янкоўскаму памерці ў нашых сэрцах: і тых, хто быў з ім побач у сямейным асяродку, і тых, хто працаваў поплеч з ім, і звычайнай публікі, якая магла хіба канстатаваць яго выхады на сцэну і насалоджвацца акцёрскім майстэрствам.

Цяпер застанецца найперш кінастужкі з яго ўдзелам. А памяць раз-пораз будзе падкідваць кадры з колішніх фестывальных "Лістападаў" і тое, як ён разбівае талерку "на шчасце". І — усе-ўсе-ўсе ягоныя ролі, праз якія ён працягвае жыць.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея БУНЦЭВІЧ

**Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ з архіва "К" і прэс-службы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі**

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванні родным, блізкім і калегам народнага артыста СССР Расціслава Янкоўскага. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Расціслаў Іванавіч па праве заслужыў званне аднаго з найвялікшых акцёраў сучаснасці. "Найвышэйшы прафесіяналізм, тонкае адчуванне псіхалогіі персанажаў і літаратурнай асновы, прыроджаная інтэлігентнасць, унікальная манера ігры далі магчымасць стварыць яму ў тэатры і кіно сотні запамінальных роляў, якія сталі неад'емнай часткай скарбніцы беларускага мастацтва", — гаворыцца ў спачуванні. Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што творчасць Расціслава Янкоўскага атрымала ўсенародную любоў і павагу калег. "Адыход яго з жыцця — незаменная страта для нацыянальнай культуры", — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

**Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста БССР і СССР Расціслава Іванавіча ЯНКОЎСКАГА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім, калегам, сябрам і ўсяму калектыву Нацыянальнага драматычнага акадэмічнага тэатра імя Максіма Горкага.**

**Калектыў Вялікага тэатра Беларусі выказвае шчырыя спачуванні родным, калегам, сябрам і блізкім з прычыны смерці артыста Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага, народнага артыста СССР Расціслава Іванавіча ЯНКОЎСКАГА.**

### Сяргей Картэс (1935 — 2016)

Сяргей Картэс — асоба ў беларускай музыцы незвычайная. Знакавая. Спасцігнуць, напоўніцу асэнсаваць зробленае ім можна будзе хіба на часавай адлегласці. Але і цяпер зразумела, што менавіта з яго твораў і ягонага колішняга кіраўніцтва Вялікім тэатрам пачаўся новы этап у айчыннай опернай класіцы.

Пастаўленыя ў нас оперныя спектаклі сталі "выязнымі", прычым вазіліся яны не толькі ў савецкую сталіцу на "справаздачу", але і на Захад — і гэта традыцыя працягваецца дагэтуль. Яго партытура "Джардана Бруна", напісаная ў 1977 годзе, стала першай вялікай беларускай операй (камерныя з'яўляліся і раней), у стылістыцы якой ярка адчуваўся подых XX стагоддзя, а не пераасэнсаваныя дасягненні XIX-га.

Паверце, наступіць той час, калі на нашай сцэне складзецца "поўны збор" ягоных опер: "Джардана Бруна", "Матухна Кураж", "Візіт дамы", "Юбілей", "Мядзведзь". Апошняя, дарэчы, летась была пастаўлена ў Самарскім акадэмічным тэатры оперы і балета, прычым нашай пастаноўчай групай: рэжысёр — Міхаіл Панджавідзэ, дырыжор — Аляксандр Анісімаў. Дарэчы, гэта далёка не першая опера Картэса, пастаўленая ў замежжы, бо той жа "Юбілей" ствараўся па замове фестывалю ў Швейцарыі, а некаторыя творы ўвогуле ішлі адначасова ў некалькіх тэатрах у розных пастановачных версіях.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным, блізкім і калегам народнага артыста Беларусі Сяргея Картэса. "Сяргей Альбертавіч унёс вялікі ўклад у развіццё нацыянальнай культуры. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў яго імя было цесна звязана з беларускай операй. Створаныя ім разнапланавыя творы вядомы як у Беларусі, так і далёка за яе межамі", — гаворыцца ў спачуванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што творчасць Сяргея Картэса стала сапраўдным прыкладам высокага мастацтва, якое заснавана на класічных прынцыпах і лепшых традыцыях айчыннай школы, арыенцірам для многіх пакаленняў беларускіх кампазітараў.**

Прыкладам для наступных пакаленняў застануцца і чалавечыя якасці кампазітара. У творчых суполках заўсёды існуюць рэўнасць, зайздрасць, спаборніцкі дух у самых яго вычварных формах, нарцысізм ды іншыя заганы. Сяргей Альбертавіч, нават калі на яго выплёсквалі ўсе самыя балючыя крыўды і жудасны гнеў, вылівалі цэбары памыяў, заставаўся чалавекам. І быў гатовы прапусціць наперад любога з калег — нават зусім маладога, адэкватна ацэньваючы прафесійны ўзровень кожнага.

Разам з ім сыходзіць частка эпохі "шасцідзясятнікаў", адным з яркіх прадстаўнікоў якой яго можна назваць. Застаецца незавершанай опера "Ладдзя Роспачы" паводле Уладзіміра Караткевіча, іншыя нерэалізаваныя задумы. Бо нягледзячы на ўнушальны ўзрост, 81 год, ён заставаўся ў душы гарэзлівым падлеткам, здольным зрушыць свет — дайце толькі пункт апоры. Але зямля разышлася пад яго нагамі. Засталіся ноты, зусім невыпадкова падобныя да зярнятак ці жыватворных кропляў вады. Два сыны, абодва музыканты, гэтак жа скіраваныя на служэнне мастацтву.

Немагчыма забыцца і на ягоную ўсмешку. Ваяўнічае прозвішча, што нагадвала пра цёзку — заваёўніка Мексікі, спалучалася ў яго з тым найвысокім узроўнем агульнай культуры, які імгненна "маляваў" на яго твары ветлівасць, добразычлівасць, зацікаўленасць праблемамі суразмоўцы. Затое застаўшыся сам-насам, Сяргей Альбертавіч гэтак жа імгненна сыходзіў унутр сябе. І зноў, як толькі хто знаёмы насустрач, — у вачах і на ўсім твары свяцілася шчырая, цалкам натуральная радасць.

Што ж да лацінаамерыканскіх каранёў (усё ж бацька яго быў чылійцам, дый дзяцінства і падлеткавасць прайшлі на іншым кантыненце), дык яны спалучаліся з рускім выхаваннем, як гэта было ва ўсіх эмігрантскіх сем'ях. І выявіліся нават не ў іншым стаўленні да музычнага рытму, як гэта ўласціва тамтэйшым жыхарам, а ў яшчэ большай, чым у каго іншага, адкрытасці насустрач усяму новаму, цікаваму, невядоламу.

Ёсць штосьці сімвалічнае ў тым, што яго адзіны балет "Апошні інка", пастаўлены ў Гаване і напісаны на замову тамтэйшага тэатра, на сцэне нашага Вялікага набыў новае лібрэта, скарачэнні ў музыцы і новую назву — "Хто Я?". Адказ на тое пытанне знойдзены: Сяргей Альбертавіч, вы не проста адзін з нашых лепшых творцаў, вы — сыходзячая эпоха. І ваша колішняя араторыя-паэма "Памяці Паэта" паводле Янкі Купалы — яшчэ і пра вас таксама.

**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю народнага артыста Беларусі Сяргея Альбертавіча КАРТЭСА і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў Вялікага тэатра Беларусі выказвае шчырыя спачуванні родным, калегам, сябрам і блізкім з прычыны смерці былога дырэктара Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР, Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, народнага артыста Беларусі, кампазітара Сяргея Альбертавіча КАРТЭСА.**

"Лічбавы" падыход

# "Безнал" ці ніяк? Вось у чым пытанне…

**Днямі на прэс-канферэнцыі журналісты спыталі ў старшыні Нацыянальнага банка Беларусі Паўла Калаўра, ці набыў ён сабе партманэ з аддзяленнем для манет: маўляў, хутка ж дэнамінацыя, падрыхтавацца трэба. На гэта той паказаў сваю банкаўскую карту і сказаў: "Гэта і ёсць маё партманэ, бо я пры разліках карыстаюся выключна карткай". Выдатна, але, відаць, на фестывалі па розных гарадах Беларусі Павел Калаўр не ездзіць. Бо там з такім "партманэ" часам магчыма і не дасі сабе рады.**

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

У якасці доказу спашлюся на канкрэтны жыццёвы выпадак. Прыехаўшы на фестываль у невялічкі гарадок на Віцебшчыне, першай справай выправіўся ў мясцовую гасцініцу. Дык вось, хоць праблем з засяленнем у мяне не ўзнікла, але ўзніклі пытанні з аплатай. Убачыўшы ў маёй руцэ банкаўскую картку, адміністратар, міла пасміхнуўшыся, сказала: "А мы картак не прымаем!" На пытанне, што ж мне рабіць, яна паказала на банк, які стаяў якраз насупраць будынка: маўляў, ідзіце туды, здыміце грошы — тады і разлічымся. Давялося так і зрабіць, а якія варыянты ў камандзіровачнага небаракі?

Трэба сказаць, што гэта быў не першы выпадак, калі па прыездзе ў пэўны райцэнтр мяне прасілі дастаць наяўныя. Асабліва — калі хацеў набыць сувенір у раённым Доме рамёстваў ці краязнаўчым музеі. У такіх выпадках часам здаралася, што ў супрацоўнікаў установы культуры тэрміналы па прыёме картак папросту адсутнічалі. Нехта запярэчыць: які там абарот сродкаў у раённых музеях ці дамах рамёстваў? Таму там хопіць і платы наяўнымі… А вось у абласных цэнтрах можна і тэрміналы ўстанавіць, бо там і людзей больш, і карткамі часцей карыстаюцца.

Усё гэта так, але — не зусім. Калі хто не ведае, у краіне дзейнічае пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 21.05.2014 № 489/7 "Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад 6 ліпеня 2011 г. № 924/16". Названым дакументам прадугледжваецца выключэнне пагранічных значэнняў выручкі для абавязковай установкі плацежных тэрміналаў, якія, у тым ліку, забяспечваюць прыём да аплаты банкаўскіх плацежных картак міжнародных сістэм Visa і MasterCard, унутранай плацежнай сістэмы "Белкарт", чыю эмісію ажыццяўляюць банкі Рэспублікі Беларусь, і ўвядзенне паэтапнага забеспячэння аб'ектаў гандлю і паслуг плацежнымі тэрміналамі. Да слова, згодна з названай пастановай, у Мінску і абласных гарадах суб'екты гаспадарання павінны былі ўстанавіць плацежныя тэрміналы не пазней за 1 ліпеня 2015 года, у гарадах раённага падпарадкавання — не пазней за 1 студзеня 2016 года, а з 1 ліпеня 2017 года — ужо на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Акрамя таго, гэтай жа пастановай Савета Міністраў краіны з 1 лютага 2016 года з пераліку выпадкаў, калі прыём наяўных грашовых сродкаў суб'ектамі гаспадарання можа ажыццяўляцца без выкарыстання касавага абсталявання, быў выключаны такі від дзейнасці, як дзейнасць па продажы білетаў (абанементаў) на наведванне выстаў, кірмашоў, атракцыёнаў у парках, культурна-відовішчных і спартыўных мерапрыемствах (музеі, канцэрты, тэатры, цыркі, стадыёны, басейны, дамы культуры ў сельскай мясцовасці, канцэртныя, а таксама другія адкрытыя і закрытыя пляцоўкі).

Для гэтай сферы дзейнасці ў Дзяржаўны рэестр мадэлей (мадыфікацый) касавых апаратаў уключаны аўтаномныя і сістэмныя партатыўныя касавыя апараты, якія могуць працаваць без падключэння да электрасеткі. Партатыўнасць мадэляў дазваляе выкарыстоўваць іх пры ажыццяўленні дзейнасці па-за асноўным месцам знаходжання суб'екта гаспадарання працяглы перыяд і выдаваць плацежны дакумент пры разліку наяўнымі грашовымі сродкамі.

І яшчэ. Той жа, названай мной пастановай у пералік аб'ектаў, дзе ўстаноўка плацежных тэрміналаў з'яўляецца абавязковай, былі ўключаны і гасцініцы. Так што, як бачна, адсутнасць у тым мястэчку Віцебскай вобласці тэрмінала для аплаты банкаўскай карткай, з'яўляецца на сёння парушэннем.

На астачу абавязкова трэба сказаць вось што. Сітуацыя, апісаная мной, сёння хутчэй не тыповая, а даволі рэдкая. У большасці выпадкаў гатэлі ахвотна прымаюць да аплаты банкаўскія карты, а ў многіх айчынных музеях і РДР "безнал" за сувенірную прадукцыю таксама ўспрымаецца як нешта звычайнае, а не неардынарнае… Але час ад часу "праколы", як бачна, здараюцца. Што ж, правілаў без выключэнняў не бывае.

К

**Сярод чытачоў, якія адрэагавалі ў Сеціве на артыкул "Дылетант" не даб'е?", быў і намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША. Ён не толькі выказаў смутак з нагоды скарачэння гісторыка-асветніцкага эфіру на тэлебачанні, але і прапанаваў запусціць у наступным сезоне вострасюжэтны тэлесерыял пра Скарыну. Мы папрасілі аднаго з арганізатараў будучага 500-гадовага юбілею беларускага кнігадрукавання патлумачыць ідэю.**

Ілья СВІРЫН

# Скарына ў ролі Бонда

## Без п'едэстала

— Яшчэ літаральна гадоў сто таму пра Скарыну не ведаў амаль ніхто, але за гэты час усё істотна змянілася. Яму прысвечаны шматлікія творы ледзь не ўсіх відаў мастацтва — у тым ліку, вядома, кіно ды тэлебачання. Адсюль і звыклы для нас яшчэ з савецкіх часоў вобраз першадрукара — як нацыянальнага героя, надзеленага адно станоўчымі характарыстыкамі. Вядома, можна працягваць адлюстроўваць яго ў гэтым самым пафасным ключы, але, як мне падаецца, гэта мала стасуецца з патрэбамі дня сённяшняга.

Як сведчаць сацыялагічныя апытанні, сёння Скарыну пазітыўна ацэньваюць літаральна ўсе пласты грамадства. Многія іншыя дзеячы беларускай гісторыі выклікаюць у розных нашых суайчыннікаў дыяметральна супрацьлеглае стаўленне, а вось першадрукара і асветніка ніхто адмоўным героем не лічыць. У той самы час, веды пра гэту постаць і цікавасць да яе пакуль што прымушаюць жадаць лепшага.

Сучаснаму чалавеку куды больш цікава бачыць на экране не "бога ў плоці", а іншага чалавека, не пазбаўленага сваіх хібаў ды слабасцяў. Тым больш, наколькі мы ведаем, Скарына акурат такім чалавекам і быў. Ён рызыкаваў, часам інтрыгаваў, адстойваючы свае правы, нават пасядзеў у вязніцы… Адпаведна, гэта асоба настолькі шматгранная, што пра яе можна зрабіць які заўгодна фільм — уключна нават са шпіёнскім дэтэктывам.

Не верыце? Вось вам прыклад. У насычанай на падзеі біяграфіі Скарыны ёсць не адзін цікавы эпізод, мала вядомы шырокай грамадскасці — і, падазраю, менавіта з-за пафасна-паэтычнага бачання Скарыны як нацыянальнага героя.

## Місія агента С.

— У 1530 годзе доктар Францішак выпраўляецца ў Кёнігсберг. Герцаг Прусіі Альбрэхт Брандэнбургскі прымае яго з вялікай пашанай, уключае ў кола набліжаных асобаў, фактычна надае дваранскую годнасць. А калі Скарына, пабыўшы там колькі месяцаў, збіраецца дахаты, ён атрымлівае падарожную грамату на адрас віленскага магістрата, дзе Альбрэхт расхвальвае яго, не шкадуючы добрых словаў.

Але літаральна праз пару тыдняў герцаг піша на тыя самыя адрасы новыя лісты зусім іншага зместу, патрабуючы неадкладна арыштаваць і выдаць яму гэтага махляра і прайдзісвета. Як выявілася, Скарына выехаў з Прусіі не адзін: ён завербаваў ды звёз з сабою двух надзвычай карысных для ўсёй дзяржавы спецыялістаў — прыдворнага друкара і лекара, якога доўгі час кіраўнік Прусіі шукаў па ўсёй Еўропе, бо ў гэтай краіне лютавала эпідэмія.

Пра што сведчаць ацалелыя да нашых дзён узоры эпісталярнага жанру? Напэўна, пра тое, што першадрукар, літаратар, перакладчык, багаслоў, гравёр, лекар, садоўнік і гэтак далей меў і яшчэ адну прафесію — агент знешняй выведкі Вялікага Княства Літоўскага. А дэмарш, які ён учыніў у Прусіі, цяжка ўспрымаць іначай, чым свядомая дыверсія.

Мяркуйце самі: Скарына быў дарадцам віленскага біскупа Яна, якога можна назваць "шэрым кардыналам" палітыкі княства (як ніяк – пазашлюбны сын караля). І ў той самы час ён рэгулярна з'яўляўся пры дварах іншых еўрапейскіх манархаў. Пагадзіцеся, нават сёння немагчыма сабе ўявіць сітуацыю, каб адна асоба адначасова служыла ў якасці дарадцы некалькім валадарам — асабліва ў тым выпадку, калі паміж імі была выразная знешнепалітычная канкурэнцыя.

Яшчэ за пяць гадоў да прыезду Скарыны Прусія мела зусім іншую назву — Тэўтонскі ордэн. Цягам некалькіх стагоддзяў гэта быў стратэгічны праціўнік ВКЛ. У 1525 годзе вялікі магістр Альбрэхт прынёс свайму роднаму дзядзьку Жыгімонту Старому васальную прысягу, паабяцаўшы пераўтварыць ордэн у свецкае герцагства. Але адразу па вяртанні ў Кёнігсберг Альбрэхт вызнае дзяржаву як пратэстанцкую і, па сутнасці, абвяшчае новае місіянерства — цяпер ужо на хвалі Рэфармацыі. Менавіта з гэтым звязаны яго захады па стварэнні той жа друкарні. Тэрыторыя ВКЛ таксама трапляла ў патэнцыйную сферу ўплыву, і, натуральна, тагачаснаму каралю і вялікаму князю не надта падабаліся такія паводзіны свайго васала.

Найбольш верагодна, што менавіта таму Скарына і апынуўся пры двары герцага. І са сваёй задачай, як бачым, справіўся, стварыўшы для Прусіі нямала праблем у сферы ідэалогіі і медыцыны. Для свайго часу гэта быў сапраўдны Джэймс Бонд!

Зразумела, вобраз шпіёна і дыверсанта мала стасуецца са такую смелую трактоўку. Бо гэта быў чалавек, які наважыўся размясціць у Біблії свой партрэт, а ў дадатак яшчэ і забяспечыць Святое Пісьмо аўтарскімі каментарыямі — нават не маючы, адзначым, духоўнага сану. Многія тады маглі ўспрыняць гэта як нахабства, але ён не збаяўся крытыкі.

У той самы час, тут вельмі важна не перагнуць палку. Адна справа — гэта ажыўляць і эмацыйна насычаць той вобраз, які многім падаецца далёкім і незразумелым, а зусім іншая — акцэнтаваць увагу менавіта на негатыве. Зрэшты, у сусветным кіно нямала годных прыкладаў, як знайсці тут "залатую сярэдзіну". Скажам, той жа "агент 007". Гэта далёка не ідэал, "нішто чалавечае яму не чужое". Але ў цэлым персанаж, без сумневу, станоўчы.

…Не так даўно мы правялі выставу "Францыск Скарына і наш час", мэтай якой было спусціць "забранзавелую" постаць на зямлю, у нашу рэчаіснасць. Таму замест узнёслых мастацкіх твораў там экспанаваліся магніцікі, завушніцы, цішоткі, банкаўскія карткі, значкі, латарэйныя білеты ды іншыя праявы таго культурнага кантэксту, які атачае нас у побыце. Дзяткам прапаноўвалася размаляваць знакамітыя гравюры, а кожны ахвотны мог усунуць галаву ў фанерны шчыт і займець сваё фота ў аблічча першадрукара. Мы імкнуліся давесці каштоўнасць яркіх гістарычных з'яваў менавіта для нашай паўсядзённасці. І варта адзначыць, што некаторыя скарыназнаўцы напачатку ўспрынялі такі праект вельмі насцярожана. Але потым яны пераканаліся, што ён — працуе, сапраўды папулярызуючы нашу мінуўшчыну сярод тых, хто наўрад ці калі адкрые навуковы фаліянт. Безумоўна, тэлепраекты павінны найперш вырашаць менавіта гэтую задачу.

К

Рэплікі пра…

**Адна са сцен у адной з залаў музея Акадэміі вытанчаных мастацтваў Сан-Фернанда (Мадрыд) была вольная ў час майго наведвання гэтай скарбніцы прыгожага. Вольная, бо Гоя, які на ёй "прапісаны", паехаў у Мінск, у наш Нацыянальны мастацкі музей. Я не адразу магу ўразумець, што збор з твораў Гоі, Пікаса, Рубенса і Веласкеса, Эль Грэка, Франсіска Зурбарана, Хасэ Рыбера, Барталамэ Мурыя (а як не згадаць Джузэпэ Арчымбольда — аўтара адзінага ў Іспаніі мужчынскага партрэта, ён жа — кветкавы нацюрморт) належыць навучальнай установе.**

Гэтыя людзі тут вучыліся, працавалі. А сур'ёзныя сувязі з калекцыянерамі дапамаглі праз час укамплектаваць музей. Класікай і сучаснымі аўтарамі. Цалкам відавочная канцэпцыя, больш дакладна, вяршыня яе піраміды: гэта іспанскае

# У рэчышчы сусветнага трэнда...

**Грошы — адзін з галоўных атрыбутаў дзяржаўнасці. Гэта не гімн, мелодыя якога прымушае мацней біцца сэрца патрыёта, не сцяг, не герб. Купюры і манеты не разлічаны на тое, каб выклікаць эмоцыі. Гэта рэчы функцыянальнага прызначэння, пазбаўленыя сакральнага сэнсу. Але менавіта яны ўвасабляюць эканамічны, а значыць — рэальны, суверэнітэт.**

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Купюрам і манетам быць прыгожымі пажадана, але неабавязкова. Больш за тое, кансерватыўны дызайн, праз які відаць, што вонкава грошы застаюцца нязменнымі на працягу дзесяцігоддзяў, можа сведчыць пра моцную эканоміку, стабільнае грамадства і высокі палітычны статус дзяржавы ў свеце. Прыклад — долары ЗША. Змены ў дызайне грошай могуць быць выкліканы шмат якімі прычынамі, у тым ліку — і жаданнем адпавядаць новым эстэтычным трэндам. Але часцей за ўсё ва ўмовах тэхнічнага прагрэсу (дасягненнямі якога карыстаюцца як законапаслухмяныя грамадзяне, так і злачынцы) гэта робіцца, каб падмацаваць "абароназдольнасць" грошай супраць падробак.

Дызайн у гэтым выпадку можа шмат што распавесці пра культурныя і гістарычныя традыцыі краіны, яе палітычны лад і ідэалагічныя арыенціры. Традыцыйна на купюрах малююць гістарычных асоб і архітэктурныя сімвалы дзяржавы. Тым часам дзяржавы невялікай палітычнай вагі, чыё асноўнае багацце складаюць прыродныя рэсурсы, упрыгожваюць грошы выявамі характэрных прыродных ландшафтаў і нацыянальных жывёл. Пасля таго, як мода на экалогію ахапіла і прамыслова развітыя краіны, аналагічныя матывы з'явіліся і на іхніх купюрах.

Моду на дызайн грошай дыктуе Еўропа. І менавіта ў Еўропе недзе з 1970-х на купюрах культура і навука замяняе палітыку і ідэалогію. Перад увядзеннем еўра на купюры наміналам 50 французскіх франкаў быў намаляваны Антуан дэ Сэнт-Экзюперы і ягоны літаратурны герой Маленькі прынц. На шведскай купюры ў 20 крон — пісьменніца Сэльма Лагэрлёф і ілюстрацыя да яе сусветна вядомай казкі пра падарожжа Нільса з дзікімі гусямі. Раней падобныя сюжэты маглі быць толькі на калекцыйных манетах, а трапіць на папяровыя грошы — ні ў якім разе.

Паводле канона папяровыя грошы маюць гарызантальную кампаноўку. Прыкладам "рэвалюцыйнага" для свайго часу дызайну грашовых купюр можна лічыць гарызантальнае размяшчэнне выяў на адным баку і вертыкальнае — на другім, альбо вертыкальнае — на абодвух. А таксама — скарыстанне замест строгіх, можна сказаць — пафасных, кампазіцый і стрыманай колернай гамы шматколернасці і складаных фотаэфектаў, якія робяць грошы падобнымі да рэкламнай улёткі. Сёння такія "прасунутыя" банкноты мае Швейцарыя і Ізраіль.

Праблема паліткарэктнасці паўстала перад краінамі Еўрасаюза пры замене нацыянальных валют на еўра. Што маляваць на купюрах, каб не зрабіць прэферэнцыі для адных і не пакрыўдзіць іншых, каб не парушыць прынцып роўнасці? Вырашылі ўпрыгожыць грошы выявамі, якія сімвалізавалі б архітэктурныя стылі асноўных перыядаў у гісторыі еўрапейскай культуры. Гэта мусілі быць вокны, дзверы (парталы) і масты. Падкрэслю, тое выходна была эстэтычная формула без нацыянальнай прывязкі. Меркавалася, што кампраміс знойдзены. Але нечакана ўсчынілі лямант брытанцы, якія ўгледзелі на купюрах масты італьянскі, нямецкі і французскі, а свайго, англійскага, не знайшлі. Праўда, яны ад пачатку ідэю адзінай валюты не ўхвалялі…

Беларусь перайшла з савецкіх грошай на свае ў 1992 годзе. Беларускія грошы, якія прайшлі праз нашы рукі з таго часу па сёння — гэта своеасаблівая хроніка станаўлення краіны і дзяржаўнай ідэалогіі. На першых разліковых білетах Нацыянальнага банка былі намаляваны дзікія жывёлы. Тады за нашымі грашыма ўсталявалася назва "зайчык", бо менавіта ягоная выява была змешчана на адной з самых хадавых купюр у адзін рубель. Я сказаў бы, што гэтыя грошы былі па-за ідэалогіяй, палітыкай, прапагандай. Потым з'яўляюцца купюры з архітэктурнымі сімваламі — Прывакзальная плошча і плошча Перамогі ў Мінску, будынак Акадэміі навук, Траецкае прадмесце, Оперны тэатр, Палац прафсаюзаў, Нацыянальны мастацкі музей, сталічны Палац спорту і спорткомплекс у Раўбічах. Заўважце, усё гэта — савецкая эпоха. За выключэннем Траецкага прадмесця, якое не больш як утульны куток мегапаліса, мінская "экзотыка", але на эпахальны сімвал (а менавіта іх малююць на грошах) не цягне. Гэта падборка не выпадковая: будуючы нацыянальную дзяржаву, мы не адмаўляліся ад савецкай гісторыі. Трэба ўлічыць, што для многіх грамадзян нашай краіны на той момант яна была духоўным апірышчам у большай ступені, чым уласна беларускія Полацкая Русь, Вялікае княства Літоўскае і Рэч Паспалітая.

Дызайн тых, першых, купюр не ўражвае. Відаць, што і ў мастакоў не хапала адпаведнай практыкі, ды і ад дзяржавы замовы на шэдэўр не было.

У 1995 годзе на грошах з'яўляюцца выявы ўжо не сталічнай, а рэгіянальнай славутасці — Брэсцкай крэпасці-героя. За ёй у народ ідуць "віцебская" банкнота з выявамі летняга амфітэатра і маста над Заходняю Дзвіной, "гомельская" — з палацам Румянцавых-Паскевічаў і рэпрадукцыяй старажытнай гравюры з відам палацава-паркавага комплексу. І, нарэшце, шыкоўная паводле дызайну і сюжэта "гродзенская" з Мірскім замкам. Гэта мая самая любімая купюра. На маю думку, яна самая прыгожая. Менавіта па ёй я буду сумаваць, калі яна выйдзе з абарачэння. У ёй акрэслілася візуальная і сэнсавая канцэпцыя, што потым лягла ў аснову вобраза новых грошай — тых, што ў абарачэнні з 1 ліпеня. У эстэтычным плане купюра з Нясвіжам менш удалая. А самы вялікі на сёння намінал у 200 тысяч з выявай Магілёўскага мастацкага музея амаль не саступае "гродзенскай" купюры па вытанчанасці і выразнасці.

Нездарма гавораць, што новыя грошы падобныя да еўра. Не толькі вонкава, але і сутнасна. Новыя беларускія рублі, як і еўра, паліткарэктныя. На купюрах прадстаўлены ўсе вобласці Беларусі, ніхто не пакрыўджаны. На іх няма гістарычных асоб і артэфактаў, якія маглі б выклікаць нервовую рэакцыю нашых суседзяў. Не мне аднаму хацелася б, каб на грошах былі выявы вялікіх постацей нашай гісторыі і культуры. Але на дадзены момант, відаць, важней праз помнікі дойлідства, што, як і выявы на еўра, увасабляюць цэлыя культурныя эпохі, паказаць нашу адвечную повязь з Еўропай і Сусветам.

Дызайн новых грошай, на маю думку, увасабляе беларускае разуменне эстэтыкі: мы не трымаемся за кананічныя формы, але і не бяжым напярэдадзе паравоза, маючы мэтай шкіраваць суседзяў сваім радыкалізмам. Нашы новыя грошы адпавядаюць надзённым стылістычным трэндам, да таго ж у іх закладзены патэнцыял эстэтычнай і функцыянальнай трансфармацыі.

Упэўнены, што калі за мяжой я дастану з партманэ новыя грашовыя знакі маёй краіны, мне не зададуць пытанне: "Беларусь? Гэта дзе?" І так будзе зразумела, што ў Еўропе.

К

# Калі Гоя паехаў у Мінск, Селяшчук можа пабываць у Мадрыдзе...

мастацтва ва ўсёй сваёй красе, а на другім месцы, наколькі я зразумела, фламандскае і італьянскае. Гоя, дарэчы, паступаў у акадэмію двойчы, у выніку не проста атрымаў адукацыю, але і стаў яе рэктарам. І яшчэ мадрыдскую акадэмію называюць першай навучальнай установай, дзе вучылі жывапісу і скульптуры. Раней чаляднікі дапамагалі майстрам і маглі быць толькі членамі рамеснай гільдыі.

Трэба аддаць належнае і прасторы — палац XVII стагоддзя, пабудаваны ў стылі барока па праекце вядомага іспанскага архітэктара Хасэ Чурыгера. Будынак знаходзіцца ў сотні метраў ад Пласа дэль Соль, на Кале дэль Алкала, па шляху да Прада. Тут жа непадалёку Музей Цысэн-Борнэміса, музей каралевы Сафіі ("Сафіду" па аналогіі з Пампіду), тут жа цэнтр сучаснага мастацтва Саіха Forum. Гэта так званы "Залаты трохкутнік мастацтваў", вельмі слаўны бульвар дэль Прада. І калі ўжо казаць аб бульварах, то каралеўскі Батанічны сад і парк Рэціро (таксама з галерэямі і помнікамі) — побач. "Сцежкі" гэтыя і для турыстаў, і для сваіх, мадрыльерас, таму што Мадрыд — месца жывое, з актыўнымі гарадскімі супольнасцямі. Тут няма адчування, што імёны Веласкеса, Далі або Міро належаць нязбытна высокай эліце. У гэтыя вуліцы і праспекты даўно вынесены мастацтва, гісторыя, паважлівае да іх стаўленне і годнае выкарыстанне. Пачнем хаця б з таго, што любое збудаванне, якому споўнілася 100 гадоў, атрымлівае ахову дзяржавы. Гэта не значыць, што яго адразу пачнуць рэстаўраваць і адкрываць музей, але яго дакладна не пачнуць разбураць, як каму захочацца.

Вернемся ад класічнага мастацтва і архітэктуры ў залы сучаснікаў — пры мне гэта была выстава "Index Roma", вынік стажыроўкі студэнтаў апошніх двух гадоў у Рыме: акадэмія прыняла рашэнне аб адраджэнні духу лабараторыі ідэй, генерацыі ведаў і даследаванняў у міжнародным арт-асяроддзі. Мяркуючы па ўсім, жанравых абмежаванняў у студэнтаў не было: ад відэафільма да комікса, net.art, дызайн, архітэктура, літаратура, музыка, скульптура, жывапіс.

Такая простая рэч, але яе трэба ўсвядоміць для сябе: навучальная ўстанова мае мастацкі музей сусветнага ўзроўню! У калекцыі 1400 карцін, 600 скульптур і 15000 малюнкаў, збор мэблі, габеленаў, сярэбраных вырабаў, гадзіннікаў і медалёў, парцаляны. Гэта пяць стагоддзяў гісторыі мастацтва, ад эпохі Адраджэння да самых апошніх тэндэнцый. 59 залаў на трох паверхах. Акрамя пастаяннай экспазіцыі, ёсць зменныя; на год наперад на сайце выкладзены план выстаў найвышэйшага класу, навукова-даследчых праектаў, канцэртаў і канферэнцый. Вельмі зручна для турыстаў, якія плануюць наведванне Мадрыда, і не заўсёды гатовыя стаяць у чарзе да знакамітых суседзяў у Сан-Фернанда.

А як у нас? Так, у нас няма сваіх Эль Грэка і Далі. І наша акадэмія не каралеўская, але ёсць беларуская школа. Мы лічым сваю жывапісную і графічную традыцыі асаблівымі, у нас ёсць чым ганарыцца ў дызайне і прыкладным мастацтве. Не згублены творы мэтраў пасляваеннага пакалення, а мастакі, якія жывуць цяпер, хіба яны не вартыя музейнага збору alma mater, тым больш у час незалежнай Беларусі. Ужо даруйце мне за пафас.

Урэшце, на сайце Акадэміі мастацтваў пазначана, што музей у ВНУ ёсць, разам з галерэяй, з 1985 года. Дзіўна, што пра яго, у адрозненне ад вельмі актыўнай галерэі "Акадэмія", лічы і невядома. Але добра, што калісьці аб ім падумалі і як структуру хоць бы фармальна захавалі. Ці ёсць у яго будучыня? Вядома ж! Колькі імёнаў! І нават не адмыслоўцы іх ведаюць: Віталь Цвірка, Андрэй Бембель, Павел Масленікаў, Гаўрыла Вашчанка, Арлен Кашкурэвіч, Леанід Шчамялёў, Анатоль Анікейчык, Май Данцыг, Мікола Селяшчук, Валерый Славук, Уладзімір Тоўсцік, Вольга Базыкіна, Цэслер і Войчанка... І гэта яшчэ не авангард, а там жа таксама і акадэмія была, і супрацьстаянне акадэміі… Якія займальныя могуць быць канцэпцыі, калі не дубляваць вядомыя музеі!

Не мне раіць спецыялістам, як рабіць, і якая стратэгія можа быць абраная імі для развіцця — не толькі акадэмічнага, з усёй сваёй выключнасцю, але і для развіцця Мінска. Я толькі хацела прывесці прыклад таго, як можа быць упісаны музей навучальнай установы ў кантэкст горада / сталіцы / краіны. Як музей ВНУ можа працаваць на ўзроўні лепшых у сваёй краіне і не здзіўлюся, калі ў свеце. Ніхто не кажа, што ў яго няма праблем, але і авангард, самае маладое мастацтва кожнага пакалення, становіцца спадчынай, і таму не варта адмаўляцца ад рэфлексіі, калекцыянавання і экспанавання назапашанага ў сталай прасторы.

**Любоў ГАЎРЫЛЮК, арт-журналіст**

**У Год культуры не толькі Віцебск памятае Марка Шагала (у 2016 годзе ў абласным цэнтры адна з вуліц названа імем Марка Шагала, адкрылася днямі і мемарыяльная дошка ў гонар мастака). У Музеі гісторыі беларускага кіно адбылася прэзентацыя перасоўнай выставы паводле анімацыйнай стужкі "Марк Шагал. Пачатак" кінастудыі "Беларусьфільм".**

# А калі серыял?

Мяркую, у работы, пра якую "К" паведамляла ў № 12, усе напярэдадзе. Маю на ўвазе поспехі на кінафестывалях, паказы за мяжой. Хацелася б, каб стваральнікі працягнулі працу над серыялам паводле аўтабіяграфічнай кнігі Шагала "Маё жыццё" з рухомымі персанажамі яго знакамітых карцін, магчымасць ужывання якіх аніматары прадэманстравалі ў "першай серыі". (Дарэчы, на расійскім тэлеканале "Культура" таксама ажываюць шэдэўры класікаў мастацтва.) І варта больш актыўна прасоўваць твор на міжнароднай арэне. Беларускія ж гледачы і госці краіны ўбачаць работу на "Славянскім базары ў Віцебску", і, будзем спадзявацца, на магілёўскай "Анімаёўцы" і Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад".

**Іван АРХІПАЎ**

# Чым “прырасла” “Берагіня”, а што не змянілася?

## Пра інфраструктуру фольк-фэсту перад гаворкай пра творчасць

**23 — 26 чэрвеня ў Акцябрскім на Гомельшчыне прайшлі заключныя імпрэзы Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва “Берагіня”. Не маючы афіцыйна статусу міжнароднага, фестываль стаў такім дэ-факта: удзельнічалі каля 900 чалавек з шасці краін. У апошні дзень мерапрыемства наведаў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў, які адзначыў высокі ўзровень падворкаў на “Рудабельскім кірмашы” і фестывалю ўвогуле.**

Алена ЛЯШКЕВІЧ,
Мінск — Акцярбрскі — Мінск /
Фота аўтара

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў і дырэктар Музея малой бацькаўшчыны У Студзіводах Дарафей Фінік.

У параўнанні з мінулымі “Берагінямі” сёлетняя “прырасла” конкурсам музычных капэл традыцыйнага складу і конкурсам танцораў-салістаў. Адзначыўшы гэтыя змены, аўтар канцэпцыі фестывалю і яго ідэйны натхняльнік, этнахарэолаг Мікола Козенка дадаў: “Мяне часта пытаюцца, а што, маўляў, новага, у вас штораз адно і тое ж. Але ж з’яўляюцца новыя асобы, калектывы, танцавальныя пары…”

Файныя былі аўтэнтычныя гурты. Іх адборам займаліся абласныя метадычныя цэнтры і выбралі, хочацца адзначыць, выдатна. Асабліва шмат эмоцый выклікалі ў публікі выступленні гурта “Вытокі” з Дзятлавічаў пад Лунінцам і “Таняжанкі” з Лельчыцкага раёна. “Вербіца” ехала ад самай мяжы з Расіяй, Хоцімскага раёна, і трапіла, што завецца, “з карабля на баль”: з аўтобуса адразу на сцэну. Акцябрскі раён меў магчымасць паказаць больш гуртоў, таму пра культуру Рудабельшчыны гледачы дакладна атрымалі самае поўнае ўяўленне.

### Міжнародны складнік

Сёлета фестываль праходзіў пад патранатам UNESCO: міжнародная арганізацыя дазволіла выкарыстоўваць свой лагатып, які з’явіўся на друкаванай прадукцыі “Берагіні” разам з лагатыпам Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны. У 2014 годзе UNESCO дапамагло “Берагіні” не толькі лагатыпам, а і матэрыяльна, пералічыўшы 5 тысяч долараў на карысць форуму. Сёлета не склалася: не паспелі ўзгадніць усе паперы, і падтрымка сталася маральнай. Але для “Берагіні” і Беларусі наогул гэта вельмі ганарова. З усіх імпрэз, што праходзяць у нашай краіне, пад патранат UNESCO ў 2016-м трапілі ўсяго дзве: акрамя “Берагіні” — Фестываль нацыянальных культур у Гродне. Анатоль Бутэвіч, член Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах UNESCO, казаў пра перспектывы ўваходжання фестывалю ў Рэестр лепшых практык аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, што складаецца ў адпаведнасці з Канвенцыяй UNESCO 2003 года.

Для рэалізацыі гэтых планаў неабходна падрыхтаваць камплект дакументацыі, зняць якасны прафесійны фільм з англійскімі субтытрамі, зрабіць фотаздымкі. Апошніх не бракуе, фестываль заўсёды прываблівае фатографаў прыгожай “карцінкай”. Скажам, з першай імпрэзы здымае “Берагіню” карэспандэнт газеты “Звязда” Яўген Пясецкі. У холе Акцябрскага цэнтра вольнага часу можна было пабачыць яго фотавыставу з выявамі мінулых “Берагінь”. Прыехалі таксама іншыя вядомыя фатографы. Некаторыя з іх здымалі фестываль ужо не першы год. Прадстаўнікі выданняў, якія звычайна не цікавіліся “Берагіняй”, распавялі, што сёлета, у Год культуры, сталі больш асвятляць рэгіянальныя фестывалі. Тэма Года культуры гучала і ў шматлікіх афіцыйных прамовах падчас форуму.

Містэрыя агню падчас "Рудабельскага Купалля".

Відэафіксацыяй імпрэз “Берагіні” сёлета займаліся збольшага аматары, як і ў папярэднія гады. Карэспандэнтаў беларускіх тэлеканалаў на свяце не было. Затое прыехалі падтрымаць свае гурты “Elektroporcelan” і “Zlatibor” прадстаўнікі сербскага тэлебачання. Здаецца, відэа за розныя гады на “Берагіні” адзнята шмат, але пытанне ў яго якасці і мантажы. Таму ўнясенне фестывалю ў Рэестр лепшых практык аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO мне бачыцца пакуль вельмі цьмянай перспектывай, хаця “Берагіня”, безумоўна, таго вартая.

У рэзалюцыі фестывалю змешчана прапанова па аднаўленні сяброўства Беларусі ў CIOFF (Міжнародны савет арганізацый фальклорных фестываляў і народнага мастацтва). На форуме недзяржаўных арганізацый, акрэдытаваных UNESCO як экспертаў у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны, у Барселоне я пазнаёмілася з прадстаўніцай CIOFF пры UNESCO Магдаленай Таворнік. Яна патлумачыла, што сяброўства краіны ў CIOFF замацоўваецца на ўзроўні міністэрстваў культуры і замежных спраў у адрозненні, напрыклад, ад сяброўства ў іншай вядомай арганізацыі, IOV (Міжнародная арганізацыя фальклорнага мастацтва). У апошняй любы сябра можа стаць ініцыятарам стварэння секцыі, што прадставіць установу, рэгіён ці краіну. Пакуль дзяржава не плаціць у поўным памеры ўнёскі, яна застаецца ў CIOFF дарадцам, а інфармацыя пра яе фестывалі не змяшчаецца ў буклетах-аглядах.

Фрагменты Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня" ў Акцябрскім.

### Замежныя гурты

З 30 гуртоў-удзельнікаў фестывалю 7 былі замежнымі — з Польшчы, Расіі, Чэхіі, Сербіі. Некаторыя наведалі “Берагіню” і ўвогуле Беларусь упершыню, былі і старыя сябры фэсту. Польская “Жэмэрва”, напрыклад, прыехала ў Акцябрскі трэцім разам. Кіраўнікі сербскіх гуртоў так-сяк размаўлялі па-руску. Літоўцы, як і на Фестывалі нацыянальных культур у Гродне, уразілі якаснай рэканструкцыяй строяў, а таксама манерай спеву, вельмі набліжанай да аўтэнтычнай. Як адзначыў старшыня Рады экспертаў “Берагіні”, кіраўнік кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Вячаслаў Калацэй, з усіх відаў традыцыйнага мастацтва спеўнае — бадай што самае складанае для пераймання.

Чэшскі і сербскія гурты паказвалі хутчэй сцэнічную, чым аўтэнтычную харэаграфію: сербы выступілі пад фанаграму, чэхі гралі частку кампазіцый “жыўцом”. Іх выступы нагадалі праграмы ўдзельнікаў фестывалю Фалькларыстычныя спатканні імя Ігнація Вахавяка ў польскім Любліне. Фестываль уваходзіць у сетку CIOFF, якая, па маіх назіраннях, збольшага падтрымлівае народна-сцэнічнае мастацтва, хаця дэкларуе ролю аўтэнтычных праграм на фестывалях.

### Інфраструктура дзеля турыстаў ці турысты дзеля інфраструктуры?

Дзе ж рассялілі 900 удзельнікаў, калі ў самім Акцябрскім менш за 7 тысяч насельніцтва? Для якога еўрапейскага фестывальнага гарадка гэта не было б праблемай, але ж у Акцябрскім гасцініца толькі адна. Таму ўдзельнікі (і беларусы, і замежныя госці) жывуць у інтэрнаце ПТК, дзіцячым садку, санаторыі, у спортзалах на матах… Некаторых селяць у вёсках за 20 — 30 кіламетраў ад Акцябрскага. Нягледзячы на такія сціплыя жыллёвыя ўмовы, бюджэт фестывалю склаў 230 мільёнаў недзнамінаваных рублёў, з іх 150 мільёнаў выдзеліў Акцябрскі райвыканкам і 80 — Міністэрства культуры.

Што да саматужных турыстаў (я іх па рэдакцыйным заданні выглядала сярод гледачоў), дык з вялікімі заплечнікамі ніхто не хадзіў, намётаў у парку не ставіў. Збольшага праграму глядзелі ўдзельнікі фестывалю і жыхары Акцябрскага. Але некалькі гасцей усё ж адшукалася. Тацяна Расмусан, беларуска па паходжанні, цяпер жыве ў Даніі, займаецца традыцыйнай вышыўкай. На фестывалі заўважыла яе па нацыянальным строі, непадобным да адзення ніводнага з гуртоў-удзельнікаў. Тацяна спланавала наведванне Беларусі пад “Берагіню” і спынілася ў Акцябрскім у сяброўкі. Музыка і танцор Ігар Вузлоў з Масквы з дзяцінства займаўся ў ансамблі “Аколіца” і добра ведае смаленскую танцавальную традыцыю, дзе пераплятаюцца элементы беларускай і рускай культуры. Раней быў у Мінску з майстар-класам, наведваў летнюю школу “Пятровіца” ў Любанскім раёне (сёлета, дарэчы, яна пройдзе 8 — 12 ліпеня). Дзеля паездкі на “Берагіню” ўзяў адпачынак на працы. Сёстры Алена і Людміла Яхімоўскія любяць вандраваць, адсочваюць культурніцкія імпрэзы ў рэгіёнах, ездзяць на традыцыйныя абрады. Пра “Берагіню” ведалі даўно, Алена была на “Рудабельскім Купаллі” ў 2014 годзе. Вось гэта, бадай, сапраўдныя турысткі: замовілі нумар у гасцініцы, харчаваліся мясцовай ежай — усё раёну прыбытак!

З аднаго боку, мала рэкламы фестывалю. Але ўявім, што ў Акцябрскі пацягнулася хаця б частка наведвальнікаў, скажам, “Славянскага базару ў Віцебску” ці "Купалля" ў Александрыі. З ежай яшчэ можна разабрацца: на “Берагіні” працаваў выязны гандаль Акцябрскага райспажыўаб’яднання. А вось з жытлом — бяда. Хіба намётавы гарадок арганізаваўся б? Але такія ўмовы адштурхнуць частку публікі, якая спаць “на зямлі” не пажадае. Ды і наступствы “турыстычнага нашэсця” трэба будзе “ліквідаваць”: для гэтага патрэбныя дадатковыя рукі, тэхніка… Атрымліваецца замкнёнае кола: не едуць турысты, бо мала рэкламы і належнай інфраструктуры. У сваю чаргу, не ідуць інвестыцыі ў інфраструктуру, бо пакуль няма буйной плыні турыстаў.

Пра конкурсы “Берагіні” — у наступных нумарах "К".

К

**У літаральным і пераносным сэнсе на чамаданах услед за рэжысёрамі ("К" № 26) апынуліся сёлетнія выпускнікі спецыяльнасці "Акцёрскае майстэрства" Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Да дыпломных экзаменаў прыйшлі завочны курс заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Лідзіі Манаковай і чацвёрты курс "дзённікаў" прафесара, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь, дэкана тэатральнага факультэта Уладзіміра Мішчанчука.**

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Уладзіміра ЖУКАВА

Максім Кошалеў.

# Ізноў чамаданны настрой

## Мікраклімат творчасці

Сёлетнім выпускнікам не пазайздросціш: яны прыйшлі да дыплому, так і не зведаўшы за студэнцкае жыццё традыцыйных магчымасцяў адукацыі ў сценах Акадэміі мастацтваў, бо тыя сцены ўсе чатыры гады (а для завочнікаў — пяць) былі на капітальным рамонце. Уладзімір Мішчанчук з горыччу сведчыць пра тое, што ў выпускнікоў не было ні студэнцкага тэатра-студыі, ні танцавальнай і спартыўнай залаў. Заняткі праводзіліся ў памяшканнях на розных канцах горада, рэпеціраваць даводзілася то ў мастацкай галерэі старога корпусу, то ў арандаваных маленькіх аўдыторыях на Партызанскім праспекце. У гэтакіх экстрэмальных умовах педагогі здзейснілі неверагоднае, здолеўшы ўтрымаць планку якасці адукацыі. "У выніку, — зазначае дэкан, — да дыпломаў прыйшлі спецыялісты, творча і псіхалагічна падрыхтаваныя да выхаду на вялікую сцэну, да працы на гледача". Тэатральны факультэт, дарэчы, працягваў падтрымліваць сувязь з прафесійнымі тэатрамі, дамаўляўся аб практыцы студэнтаў, запрашаў рэжысёраў на творчыя паказы, каб канкрэтныя ўстановы бачылі, хто ідзе на змену. Выпускныя спектаклі дзённага аддзялення прайшлі ў Тэатры юнага гледача, Тэатры-студыі кінаакцёра і Камернай сцэне Купалаўскага. Мішчанчук кажа: "Мы ўдзячныя калектывам, якія падтрымалі нас, дапамаглі рэалізаваць задуманае і паставіць кропку ў адукацыйным працэсе — абараніць дыпломы".

Вольга Марчук.

Яна Хадановіч і Сяргей Лапаніцын.

## Замалёўкі прафесіі

Першым перад дзяржаўнай камісіяй, што ўзначаліў драматург, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў Аляксей Дударай, паўстаў курс Лідзіі Манаковай. У сцэнах з п'есы Максіма Горкага "Дзеці сонца" быў задзейнічаны амаль увесь курс. Мяркую, многім выпускнікам, якія стала з'яўляюцца ў святле рампы ў тэатрах краіны, было крыху нязвыкла выступаць у студэнцкай аўдыторыі з мінімальнымі дэкарацыямі і без падтрымкі прафесійнага гукавога і светлавога афармлення. Калі адсутнічаюць дадатковыя сродкі выразнасці, выратаваць можа толькі талент і прафесійныя якасці: да гонару курсу, гэта атрымалася ў многіх. Напрыклад, сваім персанажам цікавыя характарыстыкі надалі Вольга Марчук і Максім Кошалеў. Абодва артысты-лялечнікі: Вольга — з Брэсцкага, а Максім — з Магілёўскага абласнога тэатраў.

Калі сцэнічнай пастаноўкай "Дзяцей сонца" займаўся рэжысёр-педагог БДАМ Іван Патапаў, дык другі матэрыял прапанавалі і падрыхтавалі самі студэнты. Сяргей Саўко, Яніна Саборава і Таццяна Саўко звярнуліся да тэксту моднага сучаснага драматурга Пятра Гладзіліна "Іншы чалавек". Абсурдзісцкая п'еса пра забыццё, якое нечакана навальваецца на чалавека, надзвычай папулярная на постсавецкай прасторы. Яніне Саборавай і Сяргею Саўко ўдалося разыграць удваіх як наіўнасць, так і трагічнасць чалавека, што стаіць перад прорвай асабістых успамінаў і жаданняў і не можа разабрацца, якія ж з іх — рэальнасць.

Завяршыліся дзяржаўныя іспыты канцэртнай праграмай, сімвалічна падзеленай на "вайну" і "мір". У такіх імпрэзах звычайна імкнуцца падабраць разнапланавыя нумары, каб паказаць усе акцёрскія магчымасці выступоўцаў. Вось толькі ў першай частцы канцэрта ўзнікала адчуванне, што ў студэнтаў, верагодна, не было магчымасці дасканала прадумаць сваю замалёўку, таму раз-пораз яны завяршалі выступленне, не паспеўшы "расправіць крылы". Так, крыху нервовым падаўся пластычны эцюд "Атака", а наступны — "Развітанне" — скончыўся раней, чым публіка зразумела яго драматургію… Таму больш яскрава глядзеліся нумары, якія спалучалі адразу некалькі жанраў, прынамсі, песня Наталлі Калакуставай у суправаджэнні танца Андрэя Посаха і Уладзіславы Паляевай.

## На пероне

З мноства чамаданаў пачаўся майстар-клас па творчых дысцыплінах выпускнікоў дзённага аддзялення: 17 будучых акцёраў на ўмоўным пероне развітваліся з Акадэміяй, накіроўваючыся на першае месца працы. Між іншым, сямёра аднагрупнікаў стануць калегамі: у новым сезоне яны збяруцца ў ТЮГу. Двое паедуць у Маскву: Вікторыя Ламаносава і Кірыл Дыцэвіч (пра сцэнічны шлях хлопца "К" распавяла ў № 10). Аднак апошні паабяцаў у Маскоўскім акадэмічным тэатры імя Аляксандра Пушкіна не забывацца на Мінск і браць удзел у прыватных спектаклях. Купалаўскі, Горкаўскі, Музычны, Драматычны тэатр беларускай арміі, Тэатр-студыя кінаакцёра, тэатральная майстэрня Наталлі Башавай — гэтыя калектывы чакаюць маладое папаўненне. Уладзімір Мішчанчук запэўнівае, што за апошнія трыццаць гадоў курсу такога ўзроўню — па прафесійных і чалавечых якасцях — ён яшчэ не набіраў. "Я заўсёды звяртаю ўвагу на чалавечы фактар, таму што ўпэўнены: ад яго таксама залежыць перспектыўная творчая дзейнасць студэнта. Тэатр — мастацтва калектыўнае, тут неабходна ўмець працаваць у камандзе", — падкрэслівае Уладзімір Андрэевіч.

За чатыры гады пад крыламі мастацкага кіраўніка і дацэнта кафедры майстэрства акцёра Людмілы Кучарэнка выгадавалася зладжаная каманда, пры гэтым кожны са студэнтаў змог раскрыць сваю індывідуальнасць. Маю ўвагу адразу прыцягнуў старасста курса Аляксандр Тарасаў. Яго шыкоўны Рабінзон з "Беспасажніцы" Аляксандра Астроўскага элегантна стварыў вакол сябе свята, яго мэтрдатэль у "Танцы сямі пакрывалаў" сучаснага драматурга Юрыя Ломаўцава скараў манернасцю і дзёрзкасцю, а ў канцэртнай праграме Аляксандр здзівіў цудоўнай пластыкай. На маю думку, гэты акцёр з амплуа коміка мае добры патэнцыял і здатнасць да заглыблення ў сур'ёзныя трагічныя ролі.

Курс аказаўся на дзіва музычным: большасць выпускнікоў выдатна спяваюць, валодаюць музычнымі інструментамі. Так, Кетэван Асраташвілі грала на клавішных у "Беспасажніцы" (гэты спектакль унікальны тым, што ўсё музычнае афармленне "працавала" ўжывую — паралельна з драматычнай дзеяй студэнты гралі на трубе, акардэоне і гэтак далей), задаючы рытм дзеянню. У канцэрце яна раскрылася як цудоўная спявачка, якая, выдатна інтануючы, умела карыстаецца ўсімі адценнямі голасу. "Пераможцам" у музычных здольнасцях стаў Дзмітрый Клімовіч. Хлопец не толькі цудоўна выканаў ролю Васілія Важаватава ў "Беспасажніцы": маючы ў творчым багажы спецыяльную адукацыю, ён стварыў музычнае афармленне для абодвух спектакляў, а да канцэрта ў якасці хормайстра жаночай вакальнай групы курса выдатна падрыхтаваў загаловачную кампазицыю Бруна Куле з кінафільма "Харысты". Таму не дзіўна, што хлопца забралі ў Музычны тэатр, дзе ён ужо грае дзве ролі.

Як заўважыў Уладзімір Мішчанчук, зараз мала хто "прыпісвае" акцёру тое ці іншае амплуа, маючы на ўвазе ўніверсальнасць сучасных артыстаў. Але, гледзячы на працы Ганны Богдан, у памяці адразу ўзнікае слова "травесці". Ёй цудоўна ўдалася палітра падлетка-вага эгаізму царэўны Саламеі, яе Ларыса Агудалава набыла дзявоцкую непасрэднасць і дзіцячую задуменнасць, а харэаграфічны хуліган у канцэртнай праграме выглядаў надзвычай арганічна. Спадзяюся, так жа натуральна яна ўпішацца ў калектыў ТЮГа.

Ганна грала загалоўнага персанажа "Беспасажніцы" ў першым акце, а ў другім у той жа ролі з'явілася Яна Хадановіч. Ларыса эмацыйна пасталела: гледачы сустрэліся з глыбока параненай у сэрца жанчынай, што імкнулася ўстаць з попелу разбуранага кахання, для якой смерць — сапраўды вызваленне. Яна выходзіла ў галоўнай ролі ў "Танцы сямі пакрывалаў" і разам з царыцай Ірадыядай пражывала ўсе перыпетыі жаночай долі. І ўсюды Яне дапамагаў партнёр Сяргей Лапаніцын: у першым выпадку ён — Мокій Кнураў — закаханы чалавек, якому толькі грамадскія патрабаванні не даюць магчымасці папрасіць рукі і сэрца Ларысы, у другім — асабісты ахоўнік Нарбат, гатовы пайсці на смерць дзеля царыцы. Гэты творчы дуэт надзвычай сыграны, што асабліва выявілася на канцэрце ў добра пастаўленым нумары фехтавання. Маладыя спецыялісты разам размеркаваныя ў Тэатр-студыю кінаакцёра. Магчыма, студэнцкія напрацоўкі дапамогуць ім стварыць добры акцёрскі дуэт ужо на прафесійнай сцэне.

Згодна з палажэннем аб дыпломнай працы, выпускнікі акцёрскага аддзялення павінны працаваць не толькі з рускай класікай і сучаснай п'есай, а таксама абавязкова з беларускім матэрыялам. У пералік дыпломных прац увайшоў спектакль "Радавыя", пастаўлены Уладзімірам Мішчанчуком летась. Удалыя работы выпускнікоў можна пералічваць бясконца. Відавочна, што БДАМ падрыхтаваў адданых прафесіі людзей, якія разумеюць законы сцэны. Хочацца пажадаць сёлетнім дыпломнікам, каб у творчых калектывах іх уменням і ведам знайшлося ўдалае граненне. К

Ганна Богдан.

Пра абароны дыпломаў на іншых факультэтах БДАМ — у наступных нумарах "К".

# Каштоўныя камяні з агранкай і без

**III Міжнародны фестываль “Балетнае лета ў Вялікім”, што праходзіў у чэрвені, раптам зрабіў відавочны ўхіл у харэаграфію XX — XXI стагоддзяў. Наколькі сучасным атрымаўся той кірунак?**

Надзея БУНЦЭВІЧ

Такатошы Мачыяма стаў сапраўдным героем “Балетнага лета...”

Прыкметы “Балетнага Лета ў Вялікім-2016”

### Даеш сучаснасць!

Насамрэч, такую адметнасць цяперашні фэст набыў, можна сказаць, выпадкова. Не змагла прыехаць адна з запрошаных салістак, і з афішы вывелі заяўлены папярэдне спектакль “Жызель, або Віліcы”. У выніку планаваная колькасная раўнавага паміж балетнай класікай XIX стагоддзя і чымсьці больш сучасным хіснулася ў бок далейшых пошукаў і знаходак. Адкрывалася свята двойчы паказанай прэм’ерай балета “Каханне і Смерць” з музыкай народнага артыста Азербайджана Палада Бюльбюль-аглы. Да яе дадаліся “Маленькі прынц” нашага Яўгена Глебава, а таксама два аднаактовыя харэаграфічныя шэдэўры Іржы Кіліяна — “Маленькая смерць” і “Шэсць танцаў”. У цэнтры ўвагі апынуўся і заключны гала-канцэрт, дзе пераважала харэаграфія XX — XXI стагоддзяў, склаўшы тры чвэрці нумароў. На баку залатой класікі застаўся Марыус Пеціпа, дый тое добра рэдагаваны ў далейшым: харэаграфічная карціна “Цені” з “Баядэркі” і заўсёднае “Лебядзінае возера” (дарэчы, з новым фіналам і іншымі “папраўкамі” Юрыя Траяна і Аляксандры Ціхаміравай), дзе Адэтай/Адыліяй выступіла былая наша, а цяпер пецярбургская прыма, салістка Міхайлаўскага тэатра Кацярына Борчанка.

Можа, самое жыццё вырашыла скіраваць вектар развіцця нашага тэатра на сучасныя здабыткі? І хаця далёка не ўсе з іх падаліся цікавымі, ужо адно “факт прысутнасці” бачыўся з’явай усцешнай, быццам вяртаючы нас у тыя часы, калі такія спектаклі (найперш, у пастаноўцы Валянціна Елізар’ева) пераважвалі ў якасным плане.

Сцэна з балета “Каханне і Смерць”. / Фота прадастаўлены тэатрам

### Танцы са смерцю

Пра балет “Каханне і Смерць” і яго магчымую пастаноўку ў нас Палад Бюльбюль-аглы распавядаў яшчэ летась на “Славянскім базары ў Віцебску”, дзе быў старшынёй журы конкурсу маладых выканаўцаў і атрымаў спецыяльную ўзнагароду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі “Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення”. Як бачым, прэм’ера здзейснілася, аўтар музыкі атрымаў віншаванне з ёй ад Кіраўніка нашай дзяржавы, зачытанае са сцэны тэатра перад пачаткам спектакля. Дый у прэсе з’явілася безліч самых гарачых ухвал — у тым ліку, і ад самога кампазітара, і ад доктара мастацтвазнаўства Азербайджана, прафесара Ульхяр Аліевай, якая была навуковым кансультантам пастаноўкі і адначасова не ўпершыню запрошаным на “Балетнае лета…” крытыкам.

Сапраўды, гэта была ўжо трэцяя пастаноўка балета, адрозная і ад першай — у Баку, і ад другой — у Екацярынбургу. Як распавядаў Палад Бюльбюль-аглы, бакінская версія была заснавана на ідэі зараджэння азербайджанскай народнасці, невыпадкова імёны галоўных герояў — Азер і Байджан — складаюць назву дзяржавы. Той спектакль, па яго словах, атрымаўся эпічна маштабным, з вялізнымі відэаэкранамі замест сцэнаграфіі, у ім былі дадаткова задзейнічаны артысты дзяржансамбля народнага танца, таму вывазіць балет на гастролі было праблематычна. І перад расійскім тэатрам кампазітар паставіў задачу зрабіць спектакль, прыдатны для гастрольных паказаў, што і было выканана — зразумела, з іншай харэаграфіяй.

Наша лаўрэат міжнародных конкурсаў Вольга Костэль, прыступіўшы да пастаноўкі, зрабіла цалкам новы спектакль, пачынаючы з уласнага лібрэта, але, вядома, паводле таго ж старажытнага эпасу “Кніга майго дзеда Коркута”, які быў пакладзены ў аснову балета першапачаткова. Трэба радавацца, што малады харэограф атрымала, нарэшце, сваю першую буйную працу, бо дагэтуль яна ставіла толькі мініяцюры. Што ёй удаліся масавыя сцэны, у тым ліку ваяўнічыя, у якіх бывае вельмі цяжка захаваць адчуванне сапраўднага бою. Можна ўхваляць сцэнаграфію Аляксандра Касцючэнкі, дзе пры ўсім яе традыцыяналізме ёсць вобраз-сімвал магутнага дрэва, якое ў фінале расцвітае, прычым досыць прыгожа. Неабходна адзначыць і пластычна перададзеную дыялектычную еднасць супрацьлегласцяў. Каханне ўвасоблена дуэтам, Смерць — таксама. У Пралогу яны мяняюцца партнёрамі, кожны танчыць са сваім апанентам, а не паплечнікам. Да асаблівасцяў прэм’еры дададзім увогуле даволі складаную па выкананні харэаграфію, што адрознівае пастаноўчую манеру Вольгі Костэль ад той жа Аляксандры Ціхаміравай. У балеце можна заўважыць багата адметных падтрымак, у тым ліку з выкарыстаннем элементаў гімнастыкі. Але чамусьці яны не выклікаюць таго зачаравання прыгажосцю, да якога, пэўна, павінны былі імкнуцца. Лепшым фрагментам застаецца дуэт Азера са Смерцю, дзе апошняя перамагае. Каханне ж куды менш пераканаўчае — у тым ліку, паводле музыкі.

Партытура складаецца з настолькіх адрозных пластоў, быццам над ёй працаваў не адзін творца, а некалькі. Лейттэма кахання, з якой пачынаецца балет, адсылае да сімфанізаванай эстрады 1970-х. Каларытныя сцэны народнага свята звязаны з фольктрадыцыямі савецкіх часоў. Сімфанізм як прынцып развіцця інтанацыйнага матэрыялу і, шырэй, сістэма музычнага мыслення дзесьці выяўлены на пачатковым узроўні, а дзесьці — наадварот зашкальвае. У згаданым жа вышэй дуэце, дзе саліруюць адно ўдарныя і на першы план выходзіць стыхія рытму, фольк і сучаснасць сплятаюцца разам — і сапраўды заварожваюць, прыцягваюць сваёй энергетыкай.

Касцюмы Кацярыны Булгакавай — самыя разнастайныя. Тая ж Байджан дэманструе калекцыю рознастылёвых, рознакаляровых строяў. Але ўсе гэтыя пераапрананні, тым больш пры адсутнасці яркіх лейтпластычных акцэнтаў, нівелююць вобразы галоўных герояў: Байджан у белым успрымаецца Каханнем, у чорным — Смерцю.

Можа, менавіта гэта і хацелі сказаць пастаноўшчыкі? На жаль, многія дэталі ў балеце “не чытаюцца”, застаюцца незразумелымі, пакуль не зазірнеш у праграмку. Не ўцяміць, хто ёсць хто ў Пралогу, каменныя статуі ўспрымаюцца ці то буркамі, ці то юртамі, “ажыўленне” ж камянёў выглядае часам звычайнай раніцай, калі мясцовае насельніцтва, прачнуўшыся, пакідае сваё жыллё.

Але ў цэлым спектакль — важная заваёва так званай “мастацкай дыпламатыі” ці, дакладней, “дыпламатыі праз мастацтва”. А галоўнае — нам ёсць чаму павучыцца ў азербайджанцаў.

### Эх, нам бы тую любоў...

“Каханне і Смерць” — ужо другі азербайджанскі балет на сцэне нашага Вялікага тэатра: у 2013-м былі пастаўлены “Сем прыгажунь” Кара Караева. Узгадаем і наш Музычны тэатр, які стаў “першапраходцам” у такім актыўным засваенні азербайджанскай класікі: у 2010-м там была пастаўлена музычная камедыя “Аршын мал алан” Узеіра Гаджыбекава, пазней перайменаваная ў “Вясельны кірмаш”, у 2014-м — балет “Тысяча і адна ноч” Фікрэта Амірава (дарэчы, з тым жа дырыжорам-пастаноўшчыкам Эйюбам Куліевым, які працаваў і над балетам Палада Бюльбюль-аглы), а за дзень да “Кахання і Смерці” ў Музычным адбылася прэм’ера “Клеапатры” ў пастаноўцы азербайджанскага балетмайстра Медзіны Аліевай, з кім тэатр супрацоўнічае не ўпершыню.

Усё гэта можна лічыць дадатковым прызнаннем прафесіяналізму нашых труп — і гэта, несумненна, радуе. Да таго ж, беларускія артысты маюць магчымасць паказаць прэм’еру ў Азербайджане, як гэта атрымалася, да прыкладу, з балетам “Сем прыгажунь” і, падобна на тое, плануецца з “Каханнем і Смерцю”. Але ж давайце падлічым, колькі беларускіх твораў увасоблена ў нашых партнёраў. Лічыць няма чаго — ніводнага. Няўжо нас усё яшчэ сціскаюць ланцугі недаверу да сваіх кампазітарскіх здабыткаў? Маўляў, ці можа наш нацыянальны балет быць камусьці цікавым? І не цягам адзінага паказу, як гэта адбылося з “Вітаўтам” Вячаслава Кузняцова 21 чэрвеня ў Маскве, у Вялікім тэатры Расіі, а ўключэннем такога твора ў рэпертуар.

Гэтаму і трэба вучыцца ў азербайджанцаў, не спасылаючыся на тое, што ў іх, маўляў, нафты багата. Бо ёсць і многія іншыя прыклады зусім не “нафтавых” краін — той жа Польшчы, якая куды больш прадуктыўна чым мы прасоўвае свае нацыянальныя здабыткі па ўсім свеце.

А ў тым, што ў нас ёсць чым ганарыцца — на сусветным узроўні — пераканаў заключны гала-канцэрт “Балетнага лета…” Тэмай вечарыны (рэжысёр — тая ж Вольга Костэль) стаў пошук і далейшая апрацоўка каштоўных камянёў, што параўноваліся з “агранкай” артыстаў балета і параўнаннем іх з дыяментамі — як праз тэксты з даведнікаў, так і праз аўдыязапісы размоў нашых артыстаў і педагогаў-рэпетытараў. Харэаграфічныя нумары былі рознымі — вельмі цікавымі і не надта. Не заўсёды вытрымлівалася логіка іх спалучэння са словам. За размовай пра “абдзірку-прыцірку”, што параўноўвалася з пошукамі гармоніі ў ансамблях, ішлі чамусьці сольныя нумары: маўляў, не атрымалася партнёрства? Не апраўданымі былі і паўторы відэапраекцый на розныя паводле эстэтыкі нумары.

Але які гімн прыгажосці панаваў у большасці кампазіцый! Прычым у многіх замежных балетмайстраў ён дасягаўся мінімумам сродкаў. Праз гэткую “новую прастату”, як назвалі калісьці музыку Георгія Свірыдава, выказваліся вельмі глыбокія псіхалагічныя развагі і філасофскія думкі, ствараліся надзвычай яркія вобразы, зразумелыя без “падказак” нават у выглядзе назвы нумара ў праграмы.

Асабліва вылучу “Static time” — мужчынскі дуэт Берлінскага дзяржаўнага балета ў пастаноўцы іспанскага харэографа Нача Дуата і майстэрства нашага саліста Такатошы Мачыяма, які нядаўна атрымаў ужо чацвёртую міжнародную перамогу, стаўшы лаўрэатам прэстыжнага Міжнароднага балетнага конкурсу ў Хельсінкі. Ён стаў сапраўдным героем “Балетнага лета…”, прыцягнуўшы ўвагу ў “Лебядзіным возеры” (Блазан), Вечары аднаактовых балетаў, нарэшце, у гала-канцэрце, дзе скарыў і класікай (Па-дэ-дэ з “Карсара” з надзвычай харызматычным, нават брутальным данясеннем Варыяцыі), і сучаснай пластыкай (“Клерк” з яркай, запамінальнай харэаграфіяй Юліі Дзятко і Канстанціна Кузняцова і “Фадо” з Янай Штангей у іх жа пастаноўцы, дзе яшчэ больш відавочна ўздзеянне былога нашага, а цяпер украінскага балетмайстра Раду Паклітару).

Балетныя канцэртныя праграмы вельмі рэдка з’яўляюцца ў афішы — нават у параўнанні з опернымі, якія “прапісаліся” ў Камернай зале імя Ларысы Александроўскай. Шкада. Бо вельмі цікавыя нумары ёсць і ў іншых беларускіх харэографаў — ды хаця б у Сяргея Мікеля, сёлетняга выпускніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе Валянціна Елізар’ева, які на сцэне Акадэміі нядаўна ладзіў свой першы аўтарскі (!) вечар. Але гэта ўжо іншая тэма… К

# Мастацтва душэўнай раўнавагі

## Зрэз і тэндэнцыі за 25 гадоў Незалежнасці

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Апошняя чвэрць стагоддзя была для краіны часам абнаўлення, мадэрнізацыі сацыяльнай і культурнай сферы. Але, як заўжды на вялікім пераломе, у грамадстве абвастраецца пачуццё настальгіі па беззваротна страчаным і трывогі за тое, што мусіць адысці ў нябыт альбо пасунуцца на перыферыю жыцця. Вось і пішуць мастакі, у прыватнасці — Ілона Касабука, фрагменты старой забудовы тае пары, калі на мяжы мінулага і пазамінулага стагоддзяў мегаполіс яшчэ быў утульным правінцыйным горадам з мястэчковым ладам і рытмам жыцця. Гэта працяг тэндэнцыі, закладзенай у наша мастацтва так званымі “этнаграфістамі” з паўстагоддзя назад. Тады гэта была натуральная рэакцыя правінцыі на культурны ціск метраполіі. Сёння, у суверэннай краіне, знікненне звыклых рэалій пад уплывам глабалізацыі мы ўспрымаем ужо без асаблівага драматызму, як непазбежную плату за камфорт, за прысутнасць у вялікім свеце. Ды ўсё адно, шкада таго, “што раньш было”…

Вольга Мельнік-Малахава. “Бабы” (з трыпціха).

На прыкладзе згаданага “этнаграфізму” відаць, што асаблівасцю нашай культурнай сітуацыі з’яўляецца тое, што ніводзін з мастацкіх напрамкаў, якія акрэсліліся ў 1980 — 1990-х, лічы — на мяжы эпох, не знік. Кожны мае сваю “дзялянку” ў культурным полі суверэннай Беларусі. “Усё сваё нашу з сабой” назваў сваю карціну, прысутную ў гэтай экспазіцыі, Юрый Макараў. Хто ж ведае, што ў дарозе прыдасца? У гэтым я бачу праяву нацыянальнага менталітэту. Беларусы схільныя да разумнага кампрамісу і аддаюць перавагу эвалюцыйнаму шляху, калі гаворка ідзе пра перспектыву.

Калі наш сённяшні жывапіс — гэта развіццё тэндэнцый, якія выявіліся ў папярэднія дзесяцігоддзі, дык у скульптуры адбыліся змены, дзе прысутнічае пэўная рэвалюцыйнасць. Я маю на ўвазе новую эстэтычную і сэнсавую якасць, па вызначэнні немагчымую ў Савецкай Беларусі. Згадаю прадстаўлены ў экспазіцыі праект коннага помніка герою бітвы пад Оршай князю Канстанціну Астрожскаму работы Льва Гумілеўскага. Вельмі дарэчы ў экспазіцыі кампазіцыя Уладзіміра Жбанава. Работы гэтага майстра надалі Мінску, гораду, у абліччы якога дамінуе савецкі архітэктурна-пластычны канон, выразныя рысы еўрапейскасці. Бронзавая фігура, якая стаіць проста на асфальце, без пастаменту (ды гэта яшчэ і ніякі не герой, а звычайны чалавек), сёння ўспрымаецца цалкам натуральна. Але насамрэч гэта быў прарыў у новую для нас эстэтыку. Работа на выставе называецца “Вясна Перамогі”. Гэта постаць маладой прыгожай жанчыны. Наколькі я ведаю, прататып — маці скульптара, якой яна была ў маі 1945-га. Уладзімір Жбанаў меў выключны талент ствараць абагульненыя вобразы на аснове блізкіх яму рэалій. Яшчэ я адзначыў бы скульптуры Канстанціна Селіханава і Юрыя Анушкі. Гэтыя мастакі пазбягаюць побытавай канкрэтыкі, праз гэта іх работы могуць набыць нечаканую трактоўку і сэнс, якога ад пачатку не было.

Уладзімір Жбанаў. “Вясна Перамогі” (фрагмент).

Барыс Казакоў. “Белая Русь”.


Зоя Літвінава. “Крэшчэнда”.

Уладзімір Тоўсцік. “У старым горадзе”.

Уладзімір Цэслер. “Паравоз-17”.

Магчыма, хтосьці скажа, што на выставе не стае твораў тых ці іншых мастакоў, якія таксама, як і прадстаўленыя, за мінулую чвэрць стагоддзя нямала папрацавалі дзеля культурнага суверэнітэту краіны. У прынцыпе я згодны з такімі крытыкамі, але ад сябе дадам: заўжды можна зрабіць лепш. Будзем, аднак, удзячнымі тым, хто працаваў над згаданай экспазіцыяй, бо яна праўдзіва прадстаўляе нашу краіну ў дадзены гістарычны момант.

Пасля прагляду выставы я пагартаў кнігу водгукаў. Адзін з іх мне запомніўся: “Дзякуй за душэўную раўнавагу!” Калі нехта прыйшоў у музей знерваваным і атрымаў ад гэтых карцін і скульптур спакой, дык выстава ўжо ўдалася. Я ж пабачыў у гэтай тэзе плён дваццаці пяці гадоў Незалежнасці. Хочацца думаць, што наша мастацтва насамрэч адлюстроўвае спакой і згоду ў беларускім доме. Прынамсі, спрыяе такому стану. К

# Ідэальныя пошукі

## Ад чорна-жоўтага знака да мелодыі літары “А”

**Творы графічных дызайнераў вылучаюцца лаканізмам і дакладнасцю, яны ў трэндзе: не вымяраюцца часам і амаль заўсёды зразумелыя гледачу. Цяпер у сталічным Палацы мастацтва праходзіць выстава “Ідэя!”, дзе сабраныя акурат апошнія работы.**

Вольга РОПАТ

Выставу “Ідэя!”, удзельнікі якой з’яўляюцца членамі Беларускага саюза мастакоў (куратар — Сяргей Саркісаў, старшыня секцыі графічнага дызайну), можна нават назваць “выставай ў выставе”. Справа ў тым, што на ёй экспануюцца работы, прысвечаныя 30-й гадавіне Чарнобыльскай трагедыі і 5-й — аварыі на Фукусіме. Таксама прадстаўлены экалагічныя плакаты, якія ўвайшлі ў конкурсны шорт-ліст міжнароднага біенале графічнага дызайну “Залатая Пчала” і міжнароднага трыенале экалагічнага плаката “4-ы блок” (куратары — Андрэй і Таццяна Кулажанкі). Цікавасць выклікала, па-першае, тое, як дызайнеры з розных краін (з Польшчы, Украіны, Расіі, Японіі, Германіі, Фінляндыі…) бачаць дзве трагедыі. Па-другое, непасрэдна вобразная сістэма — “пераклад” на графічную мову. Як мне падалося, аўтары некалькіх работ не “анатаміравалі” (маецца на ўвазе, не шукалі патаемны сэнс, скажам, “залаты” пласт) звычайны аб’ект. Былі плакаты, дзе абыгрываліся чарнобыльскі чорна-жоўты знак і чырвоны круг.

Вераніка Несцярук. Дызайн-канцэпцыя арт-праекту “Пазнай свой Мінск”.

Кацярына Білан. Элементы фірмовага стылю для праграмы Белдзяржцырка “Беларускія таямніцы”.

Юрый Тарэеў “Аляксандр Родчанка. 150 год з дня нараджэння 1”.

Дзмітрый Сурскі, Віталь Дамароўскі. Фірмовы знак гісторыка-культурнага запаведніка “Нясвіж”.

Кацярына Шавель. Афішы для тэатра імя Максіма Горкага.

Лізавета Абрамава. “Maitres of graphy”.

Нягледзячы на невялікі “набор” вобразных сродкаў, творы адметныя. Многія з іх — нестандартныя і запамінальныя (а ў графічным дызайне гэта, відаць, і з’яўляецца галоўным складнікам поспеху).

Асноўная выстава — “Ідэя!” — сфармiраваная і напоўненая (прабачце за таўталогію) ідэямі. Работы такой знакавай фігуры ў нашай краіне ды за яе межамі, як Уладзімір Цэслер, ведаюць усе. Скарыстоўваючы беларускае, традыцыйнае, ён удала надае сучаснае гучанне звычайным рэчам: адзіны зменены элемент або форма — і з’яўляецца новы сэнс. А галоўнае, што плакаты майстра — не “папсовыя”. І калі ў Уладзіміра Цэслера, скажам, “матэрыяламі” з’яўляецца (як першаснае і некранутае) тое, што звязана з нашымі культурай, побытам (але гэтым не абмяжоўваецца), то творы Наталлі Коўш тэматычна абмежаваныя. Летась яна прадставіла на падобнага кшталту выставе твор “Графіка танца. Sur pointes…” (гл. “К” № 40 за 2015 год), а зараз — выявы пуантаў вядомых балерын. Унікальнасць работы Наталлі — у адлюстраванні ў творах гісторыі творчага жыцця Людмілы Кудраўцавай, Наталлі Рабцавай, Вольгі Гайко ды іншых балерын, а таксама ў фактаграфічным падмацаванні пра рэпетыцыйную і сцэнічную працу. Такую ж вялікую работу — серыю з шасці аркушаў — прадставіў і Руслан Найдзен. Твор прасякнуты філасофіяй і развагамі. У мінімалістычнай серыі ён паказаў “Я” (альбо “я”) у чорна-белай прасторы. Твор, як падаецца, пра стаўленне чалавека да самога сябе, да грамадства і сябе ў соцыуме. Руслан быццам бы расклаў грамадства па пэўных пластах. Ёсць розныя “я”: ганарлівыя, амбіцыйныя, задуменныя, лірычныя, “раствораныя” ў натоўпе... Але не ўсе плакаты з “сучасным павевам”. Асобныя творы прысвечаны групе “Уновіс” і Аляксандру Родчанку. Аўтары, сярод якіх Юрый Тарэеў, працягваюць традыцыі авангарднага мастацтва пачатку XX стагоддзя.

Вартыя ўвагі і распрацаваныя элементы фірменнага стылю, лагатыпаў, знакаў. Напрыклад, Кацярына Білан прыдумала элементы для праграмы Белдзяржцырка “Беларускія таямніцы”. Мяркую, удалае, гарманічнае спалучэнне колераў (жоўтага з шэрым) вельмі пасуе гэтаму віду мастацтва, цікавыя героі. Ну і, вядома ж, дэмантсратыўнасць і відовішчнасць. На выставе можна ўбачыць і фірменны знак гісторыка-культурнага запаведніка “Нясвіж”, адзіны стыль святкаванняў 1020-годдзя хрышчэння Русі, а таксама элементы падачы інфармацыі пра мемарыяльны музей “Гродзенскі некропаліс”, урэшце, апошняя падалася перагружанай дэталямі.

Своеасаблівая дызайн-канцэпцыя арт-праекта “Пазнай свой Мінск” Веранікі Несцярук. Падаецца, прапанаванае цалкам можна здзейсніць. Па-першае, будзе нестандартна пазначана гістарычнае месца (і жыхарам усё ж такі захочацца даведацца больш цікавых фактаў пра яго). Па-другое, вобразы Веранікі запамінальныя і сучасныя, і да ўсяго — іх нескладана “ажывіць”.

Падабаюцца мне рознага кшталту эксперыменты. На многіх выставах прасочваецца тэндэнцыя: зафіксаваць нябачанае, напрыклад, гук, паветра, мелодыю… “Ідэя!” не стала выключэннем. Генадзь Мацур візуалізаваў мелодыю ветру і мелодыю літары “А”. Ёсць у ягонай графічнай працы экспрэсіўнасць і момантавасць.

Некалькі слоў дадам наконт календароў, буклетаў і афіш. Асабліва разнастайныя першыя — ад нумералогіі (фотаздымкі лічбаў, якія “жывуць” з намі і добра сябе “адчуваюць” у нашай паўсядзённасці) да стылю “ню”. Можна пагартаць і “разумны” каляндар Настассі Шарамецьевай. Цікавым падаўся твор у выглядзе літары “Т” Лізаветы Абрамавай “Maitres of graphy”. Што ні старонка — новыя творы і замежныя аўтары (Эйпрыл Грэйман, Макс Мідзінгер, Макс Біл…), а на апошняй — сціслая інфармацыя наконт асаблівасцяў творчай манеры кожнага.

Выстава “Ідэя!” засведчыла: нестандартнасць мыслення, па сутнасці, не можа існаваць без працягу традыцый. Таму экспанаванае ідэальна ўпісваецца ў нашае жыццё, яно інфармацыйна насычанае, актуальнае і разнастайнае. Ці варта было чакаць штосьці іншае ад графічных дызайнераў? К

# З усёй краіны...

## Навагрудчына / Не толькі для дачкі

**З 22 чэрвеня ў Навагрудскім раённым цэнтры рамёстваў працуе выстава лялек "Матуліна пяшчота". Тут экспануецца калекцыя Вольгі Крако.**

Вольга — шчаслівая мама дзвюх дачок: Вікторыі і Ксеніі. Калі малодшай было пяць гадоў, захацелася самой зрабіць ёй падарунак. Так была пашыта першая лялька. Майстраваць Вользе спадабалася, ды і дачка падарунку ўзрадавалася. Тады Вольга пачала шукаць выкрайкі лялек у інтэрнэце, вучыцца ў школе Наталлі Мукаўнінай па пашыве лялек "Тыльда".

Аднойчы на свяце ўбачыла выставу Раённага цэнтра рамёстваў і захацела асвоіць тэхніку лапікавага шыцця. Патрапіла на курсы, дзе навучылася шыць коўдры з лапікаў і ўдасканаліла свае "лялечныя" веды. З 2015 года Вольга пашыла больш за 50 тэкстыльных лялек. А для выставы "Матуліна пяшчота" стварыла 17 новых. У планах майстрыхі — асваенне новых тэхналогій .

А яшчэ не выставе прэзентуюцца лялькі майстроў Цэнтра рамёстваў Алены Шульга, Вольгі Юшкевіч, Кацярыны Сіневіч.

Першымі наведвальнікамі "Матулінай пяшчоты" сталі выхаванцы дзіцячага садка № 4. Яны пазнаёміліся з аўтарамі работ, паўдзельнічалі ў майстар-класах па вырабе лялек.

**Наталля КЛІМКО,**
**дырэктар Навагрудскага раённага цэнтра рамёстваў**

Раённы конкурс касцоў на Лідчыне паказаў: традыцыі продкаў не толькі зберагаюцца, але і адраджаюцца.

## Свіслач / Час кнігі

**У чэрвені ўпершыню на Свіслаччыне быў арганізаваны раённы кніжны фестываль "Кніга і час". Ён стартаваў на адкрытай пляцоўцы раённай бібліятэкі.**

Можна было набыць кніжную прадукцыю на выставе-продажы выдавецтва "Пачатковая школа", наведаць вернісаж мастакоў-карыкатурыстаў, навучыцца вырабляць закладкі і выцінанкі на тэму "Героі кніг". Дзеці знаёміліся з нестандартнымі кнігамі: пазламі, плэрамі, цацкамі.

Выставу "Самаробная кніга" прапанавала Гродзенская навуковая абласная бібліятэка імя Яўхіма Карскага. Народныя майстры падрыхтавалі выданні, выкананыя ў тэхніцы разьбы па дрэве, вышыўкі, саломкапляцення. З разнастайнымі выданнямі знаёміла пляцоўка "Бібліятэкі Свіслаччыны". Працавала летняя зала "Альтанка для чытанкі", дзе можна было не толькі пагартаць старонкі, але і пачаставацца духмянай гарбатай.

**Алена ШПАК,**
**загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Свіслацкай раённай бібліятэкі**

## Ганцавіччына / Пра двух гаспадароў старых сядзіб

**У сярэдзіне чэрвеня атрымалі запрашэнне ад калег з Ляхавіччыны наведаць першыя Фляр'янаўскія чытанні ў невялічкай вёсцы Фляр'янава, у палацапаркавым ансамблі, які з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю.**

Дадому вярталіся перапоўненыя пазітыўнымі эмоцыямі і ўражаннямі. Ляхавіцкія калегі арганізавалі на гістарычным месцы цудоўнае свята роднага слова і беларускай песні. І ўсё гэта — ля старадаўняй сядзібы і векавога дубаволата, які пасадзіла Эліза Ажэшка.

"К" пісала пра тое, што маёнтак, славуты сваім колішнім гаспадаром — філосафам Фларыянам Бохвіцам, набыў былы старшыня калгаса Генрых Траццяк, які разам з жонкай зберагае гістарычную спадчыну. Генрых Міхайлавіч актыўна падтрымаў Фляр'янаўскія чытанні, на якія сабраліся літаратары Ляхавіччыны, пісьменнік Алесь Бадак, а Нацыянальная бібліятэка краіны прадаставіла для экспанавання старадрукі. І зноў загучала тут родная гаворка, як і некалі на пачатку XX стагоддзя, калі тут гасцяваў літаратурны бамонд. Радаваўся гаспадар, што жыве сядзіба, патрэбная людзям!

Падчас адкрыцця фестывалю "Кніга і час" у Свіслачы.

Глядзела я на Генрыха Міхайлавіча і згадала свайго земляка, былога старшыню калгаса імя Кірава — Міхаіла Кунцэвіча. У Агарэвічах таксама знаходзіцца панская сядзіба — помнік архітэктуры, які захаваўся, дзякуючы гэтаму чалавеку. Яшчэ напачатку 1990-х узнікла пытанне: знесці ці захаваць лядашчы будынак сядзібы пані Апацкай. Для калгаса, нагэўна, прасцей было б падагнаць бульдозер і зраўняць з зямлёй запусцелы будынак. Але Міхаіл Міхайлавіч, настаўнік па адукацыі, ведаў сапраўдную вартасць гэтай пабудовы. Праўленне калгаса выдаткавала сродкі на рамонтныя работы. Што маглі — рабілі ўласнымі сіламі. Я памятаю, як клеілі шпалеры, фарбавалі падлогу, прыбіралі, і... сядзіба ажыла!

У шыкоўным будынку размясціўся гасцінічны комплекс. Захаваліся перад будынкам тры сажалкі, якія аблюбавалі дзікія птушкі. І гэта — у самым цэнтры вёскі! Сюды сталі прыязджаць турысты, у тым ліку з-за мяжы. А некалькі гадоў таму наведаліся на Ганцавіччыну нашчадкі рода Апацкіх і прыемна здзівіліся, што захаваўся фамільны маёнтак.

Аглядавая пляцоўка

# Чым жывяце, раён, мястэчка?

**Чарговы агляд пошты — пра чарговы летні клопат работнікаў культуры, якім сёння — не да адпачынку.**

Яўген РАГІН

Аддзел рэкламы Цэнтра культуры **"Віцебск"** паведамляе, што народнаму тэатру-студыі сучаснай харэаграфіі пад кіраўніцтвам Дзіяны Юрчанка прысуджаны прэмія і званне дыпламанта спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. У лісце адзначана, што *"нагодай для гэтай падзеі стала атрыманне калектывам II прэміі беларускага конкурсу сучаснай харэаграфіі ў рамках XXVIII Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (2015 год)"*.

*"Бібліятэкары* **Гродзенскага** *раёна прынялі ўдзел у "Бібліякаравана-2016", які быў прысвечаны 175-годдзю з дня нараджэння Элізы Ажэшка"*, — піша начальнік інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Святлана Робак. Сваёй зямлячцы скідзельскія бібліятэкары прысвяцілі выставу аднаго верша "Францішак Багушэвіч і Эліза Ажэшка", выставу адной кнігі "Людзі і кветкі над Нёманам". Удзельнікі мерапрыемства наведалі з экскурсіяй радзіму літаратаркі — вёску Мількаўшчыну, дзе на базе Гродзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі арганізаваны літаратурна-краязнаўчы музей. На літаратурным пікніку "Элізай тут усё дыхае і жыве" гучалі ўрыўкі з твораў пісьменніцы, вершы, прысвечаныя каралеве жывога слова, як яшчэ пры жыцці называў яе той самы Багушэвіч.

Наступны допіс Святланы Робак — пра "Бібліятэчны бульвар", арганізаваны на лета Свіслацкай сельскай бібліятэкай, пра тое, што сапоцкінскія гарпасялковыя бібліятэкары арганізавалі для вучняў бібліяпікнік, а скідзельскія — інтэрактыўную вандроўку па кніжных краінах.

Аўтарам чарговага допісу з **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра стала намеснік дырэктара згаданай установы Ганна Сіманенка. Яна піша: *"У* **Абухаўскім** *цэнтры культуры ансамбль танца "Лялечкі" трымаў экзамен на пацвярджэнне звання "Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь". 70 удзельнікаў выйшлі на сцэну і прадэманстравалі высокае выканальніцкае майстэрства. Канцэртная праграма складалася з харэаграфічнай сюіты і шматлікіх кампазицый"*. Натуральна, званне было пацверджана. А кіруе "Лялечкамі" заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь Надзея Урукіна, балетмайстрам з'яўляецца Тацяна Урбановіч.

У музеі-сядзібе Міхала Клеафаса Агінскага, што на **Смаргоншчыне**, адбылася прэзентацыя выставы "Па слядах Вялікага Княства Літоўскага" мастака Аляксандра Рашэтнікава. Як паведамляе намеснік дырэктара ўстановы Святлана Кенько, *"усё пачалося пад гукі паланэза до мінор №6 у выкананні юнага Яўгена Міцкевіча з Маладзечна. Мастак падзяліўся з гасцямі планамі на будучыню"*. Работы Рашэтнікава прадстаўлены ў розных тэхніках: ад алоўкавых замалёвак да акварэлі і алейнага жывапісу. Асобныя з твораў аўтар прысвяціў Агінскаму.

Яўген Лапцеў кажа, што **Слонім** даўно называецца горадам паланэзаў. *"Тут ужо ў дванаццаты раз,* — дадае пазаштатнік, — *ладзіцца адкрыты рэгіянальны фестываль "Паланэз"*. Сёлета ў ім прынялі ўдзел і дзіцячыя, і дарослыя калектывы: харэаграфічныя, аркестравыя, вакальна-харавыя. Менавіта ў Слоніме правёў дзіцячыя ды юнацкія гады Міхал Клеафас Агінскі. А ў мясцовым тэатры оперы і балета была свая капэла — адна з найбуйнейшых у Еўропе. Традыцыі, словам, адраджаюцца.

Тэатралізаванае дзіцячае свята ў Касцюковічах.

Уладзімір Жылевіч са **Століна** паведамляе, што *"ў выставачнай зале горада выпускнікі мастацкага аддзялення дзіцячай школы мастацтваў прэзентавалі работы, выкананыя алоўкам, гуашшу, акварэльнымі і акрылавымі фарбамі"*. Юных мастакоў чакае пленэр у парку "Манькавічы".

Валянціна Лук'янава, бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы **Браслаўскага** раёна спрабуе адказаць на пытанне, як выхаваць будучага чытача. Прынамсі, бібліятэкары Браслаўшчыны перакананы, што дакладны адказ трэба шукаць у сям'і: чытаюць бацькі — будуць чытаць і дзеці. У некаторых установах ужо ёсць напрацоўкі па адраджэнні сямейнага чытання. Тры бібліятэкі, Браслаўская дзіцячая, Слабодкаўская і Відзаўская гарпасялковая, працуюць па спецыяльна распрацаваных праектах, накіраваных на прыцягненне да чытання дзяцей розных узроставых груп. Браслаўская дзіцячая пастаянна ладзіць Дзень адчыне-

Першыя Фляр'янаўскія чытанні сталі сапраўдным святам роднага слова і беларускай песні.

115-годдзе гарадской бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна адзначылі ў Бабруйску.

На вялікі жаль, Міхаіл Міхайлавіч пакінуў гэты свет, але памяць аб ім на Ганцавіччыне засталася добрая і светлая, як і яго справы…

**Таццяна МАЛЯЎКА**
**загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Ганцавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы**

## Дзятлаўшчына / Дэсант і бэбі-шоу

**З сакавіка ў Наваяльнянскай гарпасялковай бібліятэцы-цэнтры зносін і інфармацыі рэалізуецца праект "Кніжны дэсант". Партнёр — Наваяльнянскія яслі-сад. Мэта праекта: спрыяць фарміраванню ўстойлівай цікавасці старэйшых дашкольнікаў да кнігі.**

Удзельнікамі праекта сталі супрацоўнікі бібліятэкі, выхавальнікі дзіцячага садка, дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту, а таксама бацькі выхаванцаў.

Яшчэ ў сакавіку бібліятэкары наведалі садок і пры дапамозе мультымедыйнай апаратуры арганізавалі літаратурны відэакалаж. Дзеці "здзейснілі падарожжа" ў краіну казак: адгадвалі загадкі, адказвалі на пытанні віктарыны, згадвалі любімыя мультфільмы. Потым было асарці "Мы гуляем і чытаем" і экскурсія ў бібліятэку. У планах — гучныя чытанні "Адпачнем разам з кнігай!", гутаркі са святаром "Духоўная кніга — дзецям"…

На наш погляд, бібліятэкі павінны ўнесці свой важкі ўклад у развіццё асобы дзіцяці, дзе выхаваўчая роля бібліятэкі будзе ўзрастаць. У канцы года мы падвядзем вынікі і арганізуем бэбі-шоу "Навагодняя казка".

**Лаура КУНЮЦІЦЕ,**
**загадчык Наваяльнянскай гарпасялковай бібліятэкі-цэнтра зносін і інфармацыі**

## Лідчына / Хто там з касой?

**Сэнс мерапрыемства закладзены ў самой назве. На сенажаці ля вёскі Ганчары СВК "Беліца-Агра" адбыўся раённы конкурс па ручной касьбе "Звініць каса — жыве вёска". Ініцыятар — Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці.**

Работнікі культуры захацелі нагадаць, што ручная касьба — неад'емная частка нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Конкурс паказаў: традыцыі продкаў не толькі зберагаюцца, але і адраджаюцца.

Нягледзячы на спёку, на конкурс з'ехалася 17 касцоў, з іх нават тры жанчыны. Самаму старэйшаму — Івану Антонавічу Матусевічу з вёскі Ганчары — 80 гадоў, а самаму малодшаму, Ільле Кудла, — 14.

Перад пачаткам працы сеназарніцы (так называлі нашы продкі-славяне жанчын, якія, захоўваючы звычаі даўніны, збіралі на сенакосныя ўгоддзі касцоў) блаславілі касцоў: абвязалі іх травянымі паясамі з лекавых укосных траў (каб спіны не балелі) і ўручылі кожнаму лялькуабярэг "Пакосніца" (нясе абнаўленне душы і цела). Пад песню "Касіў бацька, касіў я" ў выкананні народнага ансамбля бытавых інструментаў "Каханачка" Мажэйкаўскага дома культуры пачалася касьба.

Ацэньвалася не толькі яе хуткасць, але і якасць (вышыня травы пасля пракосу), чысціня касьбы (як кажуць, каб барады не было), эстэтычны выгляд пракосу. Пераможцам стаў Іван Кароль з вёскі Рулевічы, другое месца — у Станіслава Ждонца з аграгарадка Гуды, трэці — Дыяніз Машкала з аграгарадка Ваверка.

Хочацца аддзячыць спонсарам мерапрыемства: газеце "Наша слова" Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны, ААТ "Хлебапрадукт", лідскаму хлебазаводу. Упрыгожаннем мерапрыемства стала выступленне народнага тэатра беларускай народнай песні "Матуліна песня" з Гродзенскага раёна.

**Ганна НЕКРАШ,**
**метадыст Лідскага раённага цэнтра культуры і народнай творчасці**

## Бабруйск / Віват, бібліятэка!

**Аляксандра Пушкіна з Бабруйскам звязвае многае: яго імя носяць вуліца і гарадская бібліятэка, а яшчэ менавіта тут жыла ўнучка паэта Наталля Аляксандраўна.**

У дзень нараджэння бібліятэкі і самога Пушкіна была падрыхтавана святочная праграма, прысвечаная 115-годдзю нашай установы. Спачатку ладзіліся групавыя экскурсіі па бібліятэцы і пушкінскім пакоі-музеі. Выставу "Мой Пушкін" прапанавалі Бабруйская гарадская дзіцяча-юнацкая ўзорная студыя выяўленчага мастацтва "Вясёлка" і дзіцячая школа мастацтваў № 4 імя Уладзіміра Дамарада…

У чытальнай зале прадстаўлена пашыраная экспазіцыя па гісторыі бібліятэкі "Крок за крокам: хроніка падзей". Яна знаёміць з цікавымі людзьмі, якія прымалі ўдзел у стварэнні бібліятэкі або працавалі ў ёй. Унучка Пушкіна (па мужы — Варанцова-Вельямінава) з сям'ёй пражывала тады ў Бабруйску і прыняла чынны ўдзел у стварэнні бібліятэкі, падаравала шмат выданняў, у тым ліку — кніг свайго дзеда. З 1918 да 1921 года ўстанову ўзначальваў бібліятэказнаўца і бібліёграф Іосіф Сіманоўскі, заслужаны дзеяч культуры БССР, доўгія гады — дырэктар Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна. Першы дырэктар і заснавальнік Бабруйскага краязнаўчага музея Цодзік Славін таксама пачынаў працоўны шлях у гарадской бібліятэцы імя Пушкіна. Пісьменнік Барыс Мікуліч пэўны час тут працаваў.

Сённяшняя бібліятэка знаёміла з цікавай выдавецкай дзейнасцю. А перад установай працавала інтэрактыўная дзіцячая пляцоўка "Мы з дзяцінства Пушкіна любілі". Эстафету свята падхапіла акцыя "адкрыты мікрафон", у час яе гучалі вершы паэта, у тым ліку ў перакладах на беларускую мову, а таксама — прысвячэнні. У праекце бралі ўдзел члены літаратурнага аб'яднання "Полацкая галіна", артысты народнага тэатра Палаца мастацтваў Бабруйска, выхаванцы школы мастацтваў №1 імя Яўгена Цікоцкага, якія ў касцюмах пад пушкінскую эпоху чыталі вершы класіка.

Святочны вечар-канцэрт "Віват, бібліятэка! Віват, Пушкін!" у чытальнай зале падрыхтавалі выкладчыкі згаданай школы мастацтваў і вядучыя з Палаца мастацтваў. У вячэрні час быў арганізаваны кінаэкскурс "У госці ў бібліятэку", які быў завершаны паказам фільма "Імя слаўнае тваё стагоддзяў будучых набытак" на сцяне будынка.

Вельмі спадзяемся, што наша мерапрыемства закранула прысутных і выклікала цікавасць да бібліятэкі як да культурнага сэрца Бабруйска.

**Вольга ЗАЛЕСКАЯ,**
**загадчык Бабруйскай гарадской бібліятэкі імя Аляксандра Пушкіна**

Ганна Мазур. "Касцёл святога Юрыя ў вёсцы Варона".

Ткачыхі Воранаўчыны дзеляцца сваім майстэрствам.

Літаратурная вечарына ва Ушанскай бібліятэцы.

Удзельнікі "Бібліяжаравана-2016" у вёсцы Мількаўшчына.

ных дзвярэй "Бібліятэка для маладых сямей". У рамках імідж-праекта "Бібліятэка — тэрыторыя для ўсіх" Слабодкаўская бібліятэка праводзіць конкурс чытаючых сямей "Усёй сям'ёй — у бібліятэку". Відзаўская гарпасялковая бібліятэка распрацавала праект па супрацоўніцтве з дзіцячым домам сямейнага тыпу. Значна актывізавалі сваю дзейнасць па адраджэнні сямейнага чытання ў Казянскай, Друеўскай, Пагашчанскай, Мяжанскай, Ахрэмаўскай бібліятэках.

Прэс-сакратар грамадскага аб'яднання "БРСМ" Ірына Сафонава паведамляе: "У **Салігорску** *працавала пераходная выстава "Музей-бус "Кветкі Вялікай Перамогі". 24 чэрвеня бусік прапанаваў некалькі тэматычных пляцовак з выставамі пра рэчы часоў Вялікай Айчыннай вайны, з майстар-класамі па дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, з конкурсамі малюнкаў на асфальце для дзяцей…*" Гаворка пра сумесны праект БРСМ і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі.

У Бюро міжэтнічных адносін **Рэспублікі Малдова** працуе выстава мастацкай фатаграфіі "Родныя Сялібы" Ганны Мазур. Пра гэта паведамляе намеснік старшыні праўлення грамадскага аб'яднання "Беларускі культурны рух Малдовы" Людміла Гросу. А кіруе названым праўленнем менавіта Ганна. На яе здымках — родны Мінск і вёскі Астравецкага раёна, адкуль родам яе бацькі.

Тэатралізаванае дзіцячае свята адбылося ў **Касцюковіцкім** раённым цэнтры культуры. Яно называлася "У пошуках згубленага свету". Намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы Касцюковіцкага раёна Наталля Дробышава піша: "*Больш за семдзесят вучняў малодшых класаў сабраліся ў фае РЦК, дзе іх сустрэлі аніматары і роставыя лялькі. Пошукам зніклага смеху дапамаглі конкурсы і віктарыны. Культработнікі атрымалі някепскі заробак ад платнай паслугі*".

Два элементы нематэрыяльнай спадчыны **Бярозаўскага** раёна — у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Таццяна Кавалёк удакладняе: "*Гэта спорадуская полька і тэхналогія вырабу шчэпавай птушкі-абярэга вёсак Бярозаўшчыны*". Носьбіты традыцыі ёсць, трэба аб'яднаць іх намаганні. Для гэтага ў раёне ўжо другі раз ладзіцца свята-конкурс фальклорнага мастацтва "Каціўся вянок". Сёлета яно прайшло ў вёсцы Хрыса. Падчас мерапрыемства былі згаданыя святы земляробчага календара. Конкурсныя праграмы былі насычаны гульнямі, песнямі ды танцамі.

Ткачыхі **Воранаўскага** раёна прынялі ўдзел у III Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі. У рамках выставы "Белагра-2016" удзельнікі студыі "Школа ткацтва" філіяла Пагародзенскага цэнтра культуры і народнай творчасці Станіслава Міхна і Ядвіга Коўза дэманстравалі сваё майстэрства.

На базе **Ушанскай** інтэграванай бібліятэкі адбылася вечарына "Бярэзінскі васілёк на літаратурнай ніве". Падзея, як паведамляе бібліятэкар аддзела абслугоўвання Бярэзінскай ЦБ Кацярына Лясун, прымеркавана да 80-годдзя з дня нараджэння пісьменніка Івана Маркевіча. Журналісцкую дзейнасць распачаў ён у 1963-м, вучачыся на філфаку БДУ. Праз дзесяць гадоў працаваў у штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва", выдаў першы зборнік вершаў. Ён рана сышоў з жыцця, а творчы архіў родзічы перадалі ў Бярэзінскую цэнтральную бібліятэку. На падставе гэтага матэрыялу бібліятэкары выдалі зборнік вершаў Івана Маркевіча.

**У Інстытуце культуры Беларусі пачала дзейнічаць этналабараторыя. Яна была задумана для профільнай падтрымкі і стварэння дадатковых магчымасцяў па ўдасканаленні майстэрства спецыялістаў сферы культуры праз укараненне інавацыйных методык. Прадметная частка мабільнай экспазіцыі — творы народнага майстра Рэспублікі Беларусь Мікалая Тарасюка, мастака-жывапісца Васіля Жарнасека, разьбяра Мікалая Рышкевіча, якія даўно захоўваліся аддзелам традыцыйнай культуры інстытута, але не мелася магчымасці іх выстаўляць. Аснову ж склала калекцыя фалькларыста, кампазітара і лідара этна-гурта "Троіца" Івана КІРЧУКА.**

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота аўтара і Таццяны МАТУСЕВІЧ

# Генетыка этна

Іван Кірчук прэзентуе прадметы са сваёй калекцыі.

## Выбар калекцыянера з новай этналабараторыі

У пакойчыку сабраны шумавыя інструменты з розных краін свету. З'явіліся яны тут дзякуючы намаганням неабыякавых людзей. Аднойчы прарэктар па вучэбнай працы Інбелкульта Ірына Лапцёнак падышла да Івана Кірчука з ідэяй стварэння этналабараторыі. Іван Іванавіч не замарудзіў, і хутка ў інстытут на двух машынах прывезлі будучыя экспанаты. Афармленнем прасторы займалася студыя Ганны Зайцавай. На ўрачыстым адкрыцці Ірына Браніславаўна распавяла пра некалькі пластоў эксперыментальнай пляцоўкі. Першы — вонкавы — дазваляе пазнаёміцца з разнастайнасцю этнасаў праз музычныя інструменты, строі, побытавыя рэчы. Другі — інтэрпрэтацыя выстаўленага: у шафах — дыскі, кнігі, даследаванні, музычныя інструменты, якім не хапіла месца на стэндах. І трэці — глыбінны: зварот непасрэдна да сябе, да генетычнай памяці, уласных асацыяцый і ўспамінаў.

У творчай лабараторыі плануецца праводзіць майстар-класы, семінары, "круглыя сталы", трэнінгі па мабільна-адукацыйнай дзейнасці, прыкладных рамёствах, народнай сцэнаграфіі, харэаграфіі і іншых кірунках. Яе асноўнае адрозненне ад звычайнага музея ў тым, што кожную рэч можна зняць і працаваць пад час адукацыйнага працэсу. Як сведчыць Іван Кірчук, для інструмента важна, каб ён не пыліўся на паліцы, а працягваў граць. Аглядальнік "К" папрасіла Івана Іванавіча распавесці пра самыя цікавыя экспанаты з прадстаўленай калекцыі.

### Ліра

— У 1995 годзе я прыйшоў працаваць у сталічны Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі з фальклорным тэатрам "Дзіва" і сваім музеем: посцілкі, ручнікі, збаны, батлейка... Да таго мы заўсёды спявалі а капэла, а тут захацелася музычнага суправаджэння, таму і паўстала пытанне пра музычныя інструменты. У гэтым цэнтры працаваў Аляксандр Жукоўскі — майстар у чацвёртым пакаленні: ад бацькі да сына перадаваліся сакрэты скрыпак, віяланчэляў, царкоўных басоў, лір, смыкоў незвычайнай формы. Я напрасіўся ў госці да яго бацькі ў Мар'іну Горку. Усевалад Жукоўскі быў знакамітым майстрам, да яго звярталіся "Песняры", яго ліры гучаць у "Харошках", "Свяце", пачуць яго інструменты можна ў фальклорных калектывах па ўсёй Беларусі. У тую паездку я набыў смык і ліру. Праз чатыры гады ў Галандыі пісаў сольны дыск "Спадчына загінуўшых вёсак", куды ўключыў ліру. Асабліва загарэўся смыком: гэты незвычайны для мяне інструмент стаў неад'емнай часткай і ансамбля "Дзіва", і гурта "Троіца", ён прапісаны ва ўсіх альбомах, якія толькі выходзілі, але я і да гэтай пары вучуся на ім іграць. На жаль, Аляксандр — апошні прадстаўнік дынастыі скрыпачоў — не так даўно памёр, а яго майстэрства не знайшло прадаўжальнікаў...

### Цытра

— Напрыканцы 1990-х "Троіца" толькі пачынала першыя канцэрты ў Галандыі. Мясцовых жыхароў надзвычай уражвала найперш беларуская народная песня. Нас нават запрашалі на сямейныя імпрэзы, каб беларускі фальклор змаглі пачуць тыя, хто не мог патрапіць на выступленні. Так у горадзе Эйндховен мы пазнаёміліся з унікальным калекцыянерам: у фрау Банкок некалькі пакояў было адведзена пад музычныя інструменты краін свету. Высветлілася, што жанчына сталага веку сляпая, але такая акалічнасць не замінала ёй граць на клавішах і спалучаць сваё выкананне з выкарыстаннем іншых інструментаў. Сустрэча з такім чалавекам сапраўды акрыляе музыкантаў! Яна завяшчала нам некалькі экспанатаў са сваёй калекцыі. Мы атрымалі цытру (нямецкі народны струнны інструмент), якую можна пачуць у альбоме "Зімачка" ды на канцэртах "Троіцы", дзве вялікія глазураваныя галандскія акарыны. Да слова, мы імкнемся ўсе незвычайныя "здабыткі" дадаваць у партытуры, каб аздобіць нашы народныя песні незвычайным гукам. У падарунак таксама атрымалі ўнікальны гармонік, які, праўда, яшчэ трэба рэстаўраваць. Яго я яшчэ толькі асвойваю, бо там пэўны строй і неабходна вучыцца працаваць з мехам.

### Батлейка

— Я зрабіў сабе эксперыментальную трох'ярусную батлейку. Такі выгляд у лялечнага тэатра — рэдкая з'ява на Беларусі, бо ў асноўным батлеечнікі прадстаўлялі гледачам расповед пра неба і зямлю, а я дадаў яшчэ і пекла. Купалы рабіў з рознымі крыжамі: і праваслаўнымі, і каталіцкімі, бо тэксты, якія трапляюцца ў акадэмічных выданнях, напісаны на беларускай і польскай мовах. Канструкцыя разборная, памерам метр на метр, з асвятленнем. У дадатак да яе 60 лялек і чамадан масак. Задума была простая: як і ў старадаўнасці, хадзіць аднаму ды на розныя галасы гаварыць. У 1999 годзе я праехаў з батлейкай 10 гарадоў Босніі і Герцагавіны, выступаў у бальніцах, дзіцячых дамах, школах. На адным з канцэртаў разыгрываю побытавыя сцэнкі, то пішчу, то вішчу на розныя галасы за дзеда, бабу, казу, цыганоў, салдата, доктара. У канцы выйшаў на паклон, а ўся зала ўзнялася і на мяне пайшла. Я збянтэжыўся, а выявілася, што гледачы хацелі паглядзець на "астатніх акцёраў". Выступаю з батлейкай і зараз: летась колькі спектакляў даваў на айчынным фестывалі фальклорнай музыкі "Камяніца" ў скансэне пад Мінскам. Упэўніўся: тэатр добра мець, але для яго патрэбна прыдатнае памяшканне.

### Гонг

— У 1997 годзе я пазнаёміўся з шыкоўным майстрам музычных інструментаў з металу Сцівам Хабэкам з Рэйк'явіку. Яго імя вядомае ў свеце, ён працуе ў розных краінах, у асноўным эксперыментуе з металам, але можа стварыць своеасаблівую гітару і арфу. Я набыў у яго гонг, таларачкі і розныя металічныя пласціны для "Троіцы". Зараз шмат гавораць пра ўплыў розных сплаваў металу на энергетыку чалавека. Званы, званочкі, тыбецкія чаны — іх гук паводле некаторых тэорый папраўляе здароўе і амалоджвае. Згадайце тыя ж беларускія шархуны — звонкія бразготкі, якія выкарыстоўваліся ў вясельных паяздах, каб ачысціць шлях маладым. Нашы продкі меркавалі, што гук металу адганяе нячыстую сілу, нават грукат лічыў ся добрай зброяй супраць нячысцікаў. Дык вось, Сціў "падкупіў" нас эксперыментальнымі рэчамі. Прынамсі, ён калі-ніколі вывешвае свае пласціны на дрэвах ля дома, ад ветру адна аб другую стукаюцца — і гучанне тое заварожвае! Літаральна каваль свайго гуку!

### Дудкі

— Аўтар — Аляксандр Блахін, малады майстар з Ліды. Сустрэліся выпадкова: я шпацыраваў з сям'ёй ля Лідскага замка і звярнуў увагу на хлопца, які граў... на чароце! Мы завязалі шчыльныя стасункі, Аляксандр неаднойчы прывозіў да мяне ў Мінск розныя інструменты аўтарскага вырабу: жалейкі, флейты, чароткі. Ён выклікаў фурор у Вільнюсе на фольк-майстэрні, для якой выканаў шмат замоў: усе ачмурэлі, як можна на травінцы граць розныя мелодыі! А яшчэ ён добры рэстаўратар, напрыклад, мне ён аднавіў гайду — балгарскую дуду. Я колькі гадоў назіраў за яго прафесійным сталеннем: Аляксандр спрабуе займацца струннымі, варганамі. Усе яго інструменты строяць — і гэта пра многае гаворыць, бо некаторыя з айчынных майстроў прапануюць недасканала выстраеныя вырабы, ноты якіх даводзіцца падразаць і падцягваць...

### Акарыны

— Гэтыя акарыны ўражваюць арыгінальнай формай і незвычайным гучаннем. Яны ў мяне ад Ганны Мазоўкі, выпускніцы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. Яна шмат эксперыментуе з глінай і нават не заўсёды можа даць сваім вынаходніцтвам назву. Калісьці яна прынесла мне вялізарную трубу на тры ноты з гліны. Я назваў інструмент "хобатам". Потым у "Троіцы" з'явілася "бохана-ўка" — круглая, першапачаткова безыменная акарына, што нагадвала бохан хлеба. Пасля з'явіўся рог яе аўтарства. А на адкрыццё этналабараторыі спадарыня Ганна прынесла ў падарунак пяць прыгожа выкананых глазураваных акарын. Тое быў знак удзячнасці за тое, што яе інструменты мы выкарыстоўваем на канцэртах і прапісваем у альбомах.

Хочацца нагадаць пра яшчэ аднаго аўтара: Дзяніса Грома з Крупіц (ягоны бацька Уладзімір Гром быў вядомым фалькларыстам і заснавальнікам славутага калектыву "Крупіцкія музыкі"). Спадар Дзяніс зараз ладзіць сваю майстэрню ў Дудутках, ён — шыкоўны майстар, можа шмат распавесці пра гліну і абпал гліняных інструментаў. Яшчэ ў 1998 годзе я набыў у Грома пяць акарын (адна з іх — двайная, чорнага колеру), і да гэтай пары я на іх граю.

К

## Фотафакт

26 чэрвеня ў Слабодкаўскай бібліятэцы Браслаўскага раёна ў час дэманстрацыі выставы "Пясняр зямлі беларускай", прысвечанай 75-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна, адбылася прэзентацыя кнігі "Владимир Мулявин. "Сэрцам і думамі". Клуб цікавых сустрэч, які працуе пры бібліятэцы, запрасіў да сябе жыхароў і гасцей вёскі Слабодка, а таксама дырэктара Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Браслаўскага раёна Вольгу Ляснеўскую. Сустрэча са стваральніцай кнігі Людмілай Крушынскай, якая была запрошана на гэту імпрэзу, доўжылася амаль чатыры гадзіны.

**Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ,**
**бібліятэкар Слабодкаўскай сельскай бібліятэкі**

# Дашкевіч new?

**"Святло і цень" — выстава-прэзентацыя фотаработ Льва Дашкевіча, якая адбылася на мінулым тыдні ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь, спалучае арыгінальныя работы мінскага майстра і яго рэканструяваныя фатаграфіі. Апошнія — плён працы ізраільскага фатографа, спецыяліста ў галіне хімічных і іншых узнаўляльных тэхнік Барыса Равіча, створаныя адмыслова ў рамках сумеснага беларуска-ізраільскага праекта. Зрабіць падобную калекцыю натхніў калегу Алік Замосцін, прадзюсар і фатограф з Ізраіля, які адкрыў для сябе ў Мінску постаць таленавітага беларускага піктарыяліста.**

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Толькі ў красавіку гэтага года ў Іерусаліме адбылася персанальная выстава твораў Льва Дашкевіча, ініцыяваная спадаром Замосціным ды падтрыманая беларускім музеем. Днямі калекцыя рэканструяваных работ, якая сталася магчымасцю папулярызацыі імя беларускага фотамастака, была ўрачыста перададзена ў дар Нацыянальнаму гістарычнаму. На цырымоніі перадачы прысутнічала міністр аліі і абсорбцыі Ізраіля, старшыня таварыства беларуска-ізраільскага сяброўства Софа Ландвер, пацвердзіўшы крок развіцця дыпламатычных сувязяў паміж Беларуссю і Ізраілем.

## Гонар Гістарычнага

Гэты праект — цудоўная нагода прыгадаць постаць мінскага фатографа, імя якога было адкрытае беларускай публіцы ў 2002 годзе. Тады — у гонар 120-годдзя з дня нараджэння майстра была зладжана ў гэтым музеі першая персанальная выстава фотамастака "Зачараваны Беларуссю". І варта адзначыць, што яна не адбылася б без высілкаў загадчыцы аддзела пісьмовых і візуальных крыніц установы Надзеі Саўчанка, якая раскрыла таямніцу невядомай калекцыі фатаграфій, што захоўвалася ў фондах больш за 50 гадоў.

Гэта гісторыя пошукаў вартая асобай згадкі. Бо напачатку была вядомая толькі манагарама "ЛД", якая пазначала пачак фатаграфій з этнаграфічнай экспедыцыі. Але спецыяліст адразу ўбачыла почырк адметнага майстра і пачала пошукі. Так, першым поспехам у даследаванні сталася знаходка спісу ўдзельнікаў экспедыцыі ў "Белоруссию" Наркамасветы і Выстакамбела 1923 года, дзе і было пазначана імя "Леў Дашкевіч". Нітачка пацягнулася — і спецыяліст выйшла на звесткі пра выкладчыка сусветнай літаратуры і фатаграфіі Мінскага інстытута народнай адукацыі з такім іменем у Нацыянальным архіве. Далей — падрабязныя звесткі біяграфіі шляхціча герба "Ляліва" выявіліся ў архіве КДБ: аказваецца, фатограф праходзіў сведкам па справе Саюза вызвалення Беларусі, быў пад следствам тры месяцы, пасля — вызвалены. Нітачка абарвалася. Але выратавала даследаванне наступнае: у далейшых пошуках Надзея Саўчанка выпадкова знаходзіць працу па фізіцы цвёрдага цела, аўтар якой — Леанард Дашкевіч. Гэта была проста невераготная знаходка, якая прывяла спадарыню Надзею да апошняга спадкаемцы фатографа — яго сына, які жыў у Маскве і якому на той час было больш за дзевяноста гадоў. Падарожжа ў сталіцу суседняй дзяржавы — і Леанард Львовіч раскрыў піктарыяльную калекцыю фатаграфій свайго бацькі, якая і сёння прымушае візуалаў з усяго свету прызнаваць майстэрства яе аўтара. Больш за тое: сын падараваў арыгінальныя работы бацькі беларускаму музею.

## Аўтарская рэканструкцыя

"Калі я ўбачыў фатаграфіі Льва Дашкевіча, — кажа Алік Замосцін, — адразу адчуў у ім выбітнага аўтара. Нарадзілася ідэя адрэстаўраваць пэўныя здымкі, рэканструяваць іх згодна аўтарскай ідэі".

Замосцін запэўнівае, што копіі арыгінальных адбіткаў зроблены ў адпаведнасці з задумкай аўтара. Але, мяркуючы, што параўноўваць арыгіналы і копіі з іх, няхай нават самыя дакладныя, заўжды будзе выпрабаваннем для апошніх.

Варта адзначыць, што творчасць Льва Дашкевіча разнастайная: у яго практыцы ёсць стрыманая дакументацыя, этнаграфічныя замалёўкі, тым не менш, менавіта яго фатаграфіі, зробленыя ў так званых альтэрнатыўных тэхніках, лічацца перлінамі калекцыі. Гуміарабік, браймоль, пігментны друк, рознакаляровае таніраванне — Леў Дашкевіч таленавіта выкарыстоўваў разнастайныя фотатэхнікі. І Барыс Равіч паспрабаваў аднавіць работы акурат у адпаведных таніраваных варыянтах.

## І ўсё ж такі святло

Напрыканцы, яшчэ раз пра біяграфію мінскага фатографа. Медык, філолаг, Леў Дашкевіч вывучаў фатаграфію ў Вышэйшай школе графічных мастацтваў у Парыжы. Выкладаў у гімназіях Эрывана і Тыфліса, служыў дзяржаўным фатографам урада Азербайджанскай рэспублікі. Калі ў 1920-я вярнуўся ў Мінск, адным з першых стаў выкладаць фатаграфію ў сталічным інстытуце народнай адукацыі, працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы БССР, як навуковы фатограф на медыцынскім факультэце БДУ, а і далей у 1930-я — у 1-й клініцы Мінскага медінстытута, Інстытуце тэарэтычнай і клінічнай медыцыны Акадэміі навук БССР... Даследаваў магчымасці дыягностыкі захворванняў з дапамогай люмінесцэнцыі — вывучаў уздзеянне святла на чалавека. Нагадаць гэтыя моманты важна, каб зразумець этапы станаўлення фотамастака, яго кругагляд, вымушаны і заканамерны сыход у навуку, прадыктаваны рэпрэсіямі 1930-х.

У сваіх піктарыяльных работах Леў Урбанавіч выяўляе дзівосны поступ святла ў паўсядзённым жыцці. Яго фатаграфія выразная, жывапісная, але яе асаблівая радасць — паветра. Гэта напаўненне кадра святлом — і — адпаведна — асобнага жыццёвага імгнення. Тое найбольш заўважна ў яго інтэр'ерных здымках, але пейзажы, побытавыя сцэны вылучаюцца не толькі "прыгажосцю кадра", але сваім запаволеным, сузіральным настроем. І ад таго інтымнасцю.

І яшчэ адно — вядомую фатаграфію Янкі Купалы 1925 года, якую прынята лічыць іканаграфічнай, таксама зрабіў Леў Дашкевіч.

Плануецца, што наступнае месца экспанавання выставы "Святло і цень" — Астана. К

Фота Льва Дашкевіча з фондаў музея.

З "Куфра-радцы"

# Беларусь — ты мой сон велікодны

**Паколькі чытачы "К", якія так ці інакш звязаныя з музыкай, неаднойчы цікавіліся магчымасцю ўзнаўлення публікацый новых песень беларускіх кампазітараў, будзем па меры магчымасці рабіць такія матэрыялы.**

**Музыка** Эдуарда ЗАРЫЦКАГА **Словы** Рыгора БАРАДУЛІНА










**1.** Беларусь —
ты мой сон велікодны,
Сон, што сніцца
анёлам вясной.
Зрок і слых мой
табою галодны,
Дух жыве мой
табою адной.

**Прыпеў:**
Гэта ведае, ведае
неба ды Мама —
Без цябе, без цябе
не бывае мяне.
І душа жыць не можа,
не можа без храма,
Цяжка ёй у чужой,
у чужой старане.

**2.** Беларусь, —
я малюся табою,
Я табе лепшай
долі прашу.
Беларусь, —
ты іконай святою,
Асвяціла
ласкава душу.

**Прыпеў.**

## Будзем на сувязі!

**Паважаныя чытачы!**

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце ў акаунтах kimpressby** у сацыяльных сетках **Facebook, Vk, Twitter, Instagram**

# Поплеч з рыцарамі

## Актрыса Вольга Куляшова пра бацьку — народнага артыста, адкрыццё Караткевіча і прафесію

**26 чэрвеня народнаму артысту Беларусі, акцёру-коласаўцу Уладзіміру Куляшову споўнілася б 75. Амаль 17 гадоў прайшло з таго дня, як ён пайшоў з жыцця, але калегі па сцэне, прыхільнікі яго магутнага таленту прыгадваюць майстра сцэны і вобразы, створаныя ім. Успамінамі пра бацьку падзялілася з намі яго дачка, актрыса Коласаўскага тэатра Вольга Куляшова. Гэты год стаў знакавым для яе сям'і: у студзені адзначыла сваё 75-годдзе маці, артыстка Ніна Левашова, ды і сама Вольга Уладзіміраўна зусім хутка, у жніўні, адзначыць сваю круглую дату.**

Вольга Куляшова ў спектаклі "Мудрацы..."

Уладзімір Куляшоў у спектаклі "Філумена Мартурана".

— Мая матуля — выдатная апавядальніца, знаўца фальклору. Мяне з братам выхоўвалі на казках, а песенька на ноч — гэта як абавязковы рытуал. Калі мы ўжо крыху падраслі, да выхавання падключыўся бацька. Паэмы Лермантава "Мцыры", "Дэман", "Барадзіно" ён чытаў так жыва, так эмацыйна, што хутка і мы, дзеці, паўтаралі следам за ім гэтыя радкі, як мантры. Потым былі Пушкін, Ясенін і, вядома ж, улюбёны ім Маякоўскі. Чытальнік ён быў адметны! Прычым здавалася, што яму ўсё адно, перад кім ён выступае: перад вялікай аўдыторыяй, ці ў хатняй абстаноўцы перад малалетнімі слухачамі: аддача тая ж. Памятаю вельмі яркі эпізод з дзяцінства ў час святкавання 1000-годдзя Віцебска. Бацька вядзе мяне за руку па шыкоўна ўпрыгожаных вуліцах. Ён поруч такі шчаслівы, такі прасякнуты святлом. Уваходзім праз службовы ўваход у тэатр: паўсюль шчаслівыя твары. Узнімаемся на шосты паверх, там вялізнае памяшканне, дзе зазвычай працуюць мастакі. Вокны расчынены, а на падваконнях шчыльна сядзіць, як вераб'і, звесіўшы ногі на дах, шумная тэатральная арцель. Нехта тут жа мяне падхоплівае і ўсаджвае побач. Адтуль відаць Кіраўскі мост, запоўнены людзьмі. А па Дзвіне плывуць плыты, на адным з якіх — княгіня Вольга са сваёй дружынай. Усё гэта мне тлумачыць з-за спіны бацька. А побач радасна гамоняць людзі, частуюцца, смяюцца. І я адчула, што сям'я — гэта не толькі бацькоўскі дом, а яшчэ і тэатр. Цяпер, праз гады, я разумею, што тое шчасце, якім быў прасякнуты тата і ўсе астатнія коласаўцы, тлумачыліся не толькі святам, але і вялікім духоўным уздымам, што быў звязаны з прыходам у тэатр Уладзіміра Караткевіча. У тэатры толькі што прайшла прэм'ера "Званоў Віцебска", прымеркаваная да юбілею горада. Гэта была, вядома, мастацкая з'ява. І творчы багаж бацькі папоўніўся яшчэ адной знакамітай роляй, супрацоўніцтвам з выдатным пісьменнікам, якое неўзабаве, праз пяць гадоў прадоўжыцца, калі Коласаўскі тэатр увасобіць трагедыю "Кастусь Каліноўскі", дзе Уладзімір Куляшоў створыць цэнтральны вобраз. Я ганаруся тым, што лёс звёў гэтых двух выдатных асоб, блізкіх па адносінах да мастацтва і жыцця. Маё ж асабістае адкрыццё Караткевіча адбылося напрыканцы 1970-х, калі ўвесь тэатр запоем чытаў яго раман "Дзікае паляванне караля Стаха", надрукаваны ў часопісе "Нёман". Не выключэннем стала і мая сям'я. На жаль, я, з прычыны свайго юнага ўзросту, не бачыла такія выбітныя пастаноўкі, як "Званы Віцебска" і "Кастусь Каліноўскі", але спадзяюся, што тэатр знойдзе магчымасць набыць тэлевізійны запіс гэтых спектакляў, каб паказаць іх акцёрскай моладзі. За 35 гадоў бацька стварыў больш за 100 сцэнічных вобразаў, але прайшоўшы частку свайго творчага шляху паплеч з Караткевічам, зразумеў, што ён, рускі чалавек з берагоў Волгі, невыпадкова апынуўся тут, на гэтай зямлі, у гэтым тэатры. Да апошніх дзён яго жыцця я бачыла ў ягоным кабінеце партрэт Кастуся Каліноўскага. Прыгожы чалавек з адкрытым тварам і адкінутай назад пасмай валасоў. Яны былі сапраўды вельмі падобныя з бацькам. Толькі потым я зразумела, чаму ён так доўга не развітваўся з гэтым партрэтам, спярша ў тэатры, а пасля і дома. Ён быў свайго кшталту сімвалам, які звязваў бацьку з гэтай зямлёй, з гэтай сцэнай. А яшчэ я згадваю, з якой любоўю і пашанай тата ставіўся да сваіх блізкіх. Яго вельмі хвалявала і ўсцешвала, калі я прыходзіла глядзець спектаклі, дзе ён іграў. Сам сустракаў мяне на службовым уваходзе, чакаў, быццам рыцар. Гэта было вельмі крана льна. Я цяпер разумею, што для яго было вельмі важна ўбачыць у зале родныя вочы. А ён жа сам быў вельмі суровым, бязлітасным крытыкам, у тым ліку і да сябе самога. З цягам часу бацька стаў часцей са мной гутарыць, размаўляць пра тэатр, кнігі, нейкія жыццёвыя ўражанні. Наступіў момант, калі я стала для яго раўнацэннай суразмоўцай. Ён па-філасофску глядзеў на рэчы, казаў, што жыццё — гэта пастаянны выбар, і я павінна зрабіць яго сама, бацька не можа за мяне вырашаць.

■ ■ ■

— У школе я хацела стаць біёлагам, любіла прыроду, займалася ў гуртку юных натуралістаў і нават атрымлівала.

Сцэна са спектакля "Кастусь Каліноўскі" паводле трагедыі Уладзіміра Караткевіча (Уладзімір Куляшоў — злева).

З "Куфра-радцы"

# Карабель маёй краіны

**Музыка** Алега МОЛЧАНА **Словы** Алеся ЛІПАЯ





**1.** *Карабель маёй краіны —*
*каляровы, папяровы, —*
*скралі воды ручаіны*
*і нясуць у вір, у сховы,*
*праз лугі і праз дубровы,*
*праз мой лёс і вашы лёсы;*
*ледзьве падбіраю словы,*
*ледзьве стрымліваю слёзы...*

**Прыпеў:**
*Я бягу ўслед за ім*
*па затопленым беразе.*
*Я імкнуся дагнаць яго, —*
*хіба не верыце?*
*На бягу абдзіраючы мары і рукі;*
*вам, відаць, збоку смешныя*
*гэтыя рухі;*
*адчуваю: вось-вось*
*маё цела штурхне адчай*
*у вірлівы халодны*
*каламутны лясны ручай;*
*спадзяюся, тым самым*
*на бераг я выплісну*
*і ўратую хаця б яшчэ на адну вясну.*

**2.** *Карабель маёй краіны —*
*каляровы, папяровы, —*
*што праз некалькі хвілінаў*
*згіне ў водах ручаіны;*
*што ўжо некалькі стагоддзяў*
*гіне ў вечнай боскай плыні;*
*я малю: даволі! годзе!*
*дайце шанц маёй краіне!*
**Прыпеў.**

**3.** *Карабель маёй краіны —*
*каляровы, папяровы, —*
*у мяне такі адзіны,*
*мне не трэба нейкі новы.*
*Не змяняю на чужога, —*
*а патрэбен толькі гэты,*
*ён ад прадзедаў і Бога*
*мне адзіным запаветам.*
**Прыпеў.**

ла нейкія граматы. Пра тэатр думала менш за ўсё. У старэйшых класах зацікавілася паэзіяй, вядома, не без уплыву бацькоў. Аднойчы на ўроку мяне выклікалі пачытаць Блока. Я чытала 45 хвілін —выдала ўсё, што накапілася, з'явілася нейкае жаданне падзяліцца тым духоўным багажом, што прыйшоў да мяне ад бацькоў. Для настаўніцы і ўсяго класа гэта стала адкрыццём. Дарэчы, педагог, сама прыхільніца коласаўскіх акцёраў, і параіла паступаць у тэатральны. Бацька нічога пра тое не ведаў, маці таксама гэтага не вельмі жадала. У свой час, пасля першых роляў тут, я перайшла ў Альтэрнатыўны тэатр, хоць у мяне былі цікавыя работы, напрыклад, Мар'я Антонаўна ў "Рэвізоры", які ставіў Барыс Эрын. Тут сышліся мы ўсе ўтрох: мама грала Ганну Андрэеўну, бацька — Осіпа. Але запрасілі ў Мінск, там фактычна сабраўся ўвесь наш курс, і гэты кліч аказаўся больш моцны. У 1999 годзе пайшоў з жыцця бацька, а ў 2003-м памёр Андрэй Андросік, мой кіраўнік курса. Гэта былі тыя два чалавекі, на якіх я магла абаперціся ў жыцці.

■■■

— Для нармальнай работы на сцэне патрэбен збалансаваны "рацыён". Акцёру таксама важна паспрабаваць розныя жанры. Калі ён грае толькі камедыйныя ролі ды казкі, гэта ненармальна, акцёр пачынае хварэць. У той жа час ёсць выканаўцы, якія выдатныя комікі ад Бога. Яны самі гэта разумеюць і не вельмі імкнуцца да іншага.

Як глядач я больш за ўсё люблю трагедыі і драмы. Для мяне важна адчуць катарсіс. Тады я ведаю, што недарэмна прыйшла на фільм ці спектакль. А як актрыса больш люблю, як ні дзіўна, камедыйныя ролі. Але часцей здараюцца спектаклі, дзе пераплятаецца смешнае і драматычнае. Напрыклад, "Пазычанае шчасце" Палачаніна альбо "Мудрацы" Астроўскага.

■■■

— Каб мне прапанавалі выбраць самой рэжысёра, нават самага знакамітага, пэўна, выбрала таго, хто ідзе ад акцёра, улічвае яго індывідуальнасць. Гэтыя ў большым выйгрышы. Таму я з асаблівай цеплынёй згадваю Генадзя Шкуратава, пастаноўшчыка "Адэлаіды", які літаральна насіў артыстаў на руках, і Антона Грышкевіча, з якім мы сышліся ў "Фрэкен Юліі". Удзячная і Рыду Таліпаву, што разгледзеў ува мне такія рысы, пра якія я і сама не ведала. Разлічвала на сумесную работу ў далейшым, але жыццё, на жаль, унесла свае карэктывы. Сёння я з аптымізмам і надзеяй гляджу ў заўтрашні дзень. Лічу, што ў гісторыі такога тэатра, як наш, мусіць быць дастойны працяг. І звязаны ён будзе са з'яўленнем новых рэжысёрскіх імёнаў, увогуле яркіх творчых асоб. Магу пажадаць сабе і маім калегам стаць годным працягам багатай і цікавай гісторыі Коласаўскага.

**Занатаваў Юрый ІВАНОЎСКІ, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа.**

**Выстава графікі "Горад, які мы не бачылі. Мінск на малюнках 1940 — 1950 гадоў", разгорнутая цяпер у Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва, паказвае, як выглядаў Мінск пасля вызвалення. Таксама можна пабачыць некоторыя эпізоды новага будаўніцтва на праспекце імя Сталіна. Работы аўтарства Іосіфа Лангбарда, Георгія Заборскага, Уладзіміра Караля, Сяргея Святліцкага, Уладзіміра Стальмашонка. Усяго — пяць дзясяткаў твораў.**

Георгій Заборскі. "Мінск. 24 чэрвеня 1941 г.".

Сяргей Святліцкі. "Вуліца Нямігская".

# Горад, якога не ведаеш

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Калі чалавек робіць выдатную кар'еру і праз гэта становіцца цікавым грамадзе, дык цікавасць тая распаўсюджваецца на ўсю ягоную біяграфію. Тое ж здараецца з краінамі і гарадамі. Імклівае па гістарычных мерках узыходжанне Мінска ад губернскага цэнтра Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі да сталіцы немалой еўрапейскай дзяржавы не можа не ўразіць. Уся тысячагадовая гісторыя горада — пад пільнай увагай даследчыкаў. Здаецца, што кожны перыяд падрабязна разгледжаны і грунтоўна асэнсаваны. Пры гэтым, бадай, ніводзін з іх не выклікае столькі палемікі, столькі супярэчлівых ацэнак у гісторыкаў беларускай культуры, як першае дзесяцігоддзе пасля вызвалення Мінска ад фашысцкіх акупантаў. Я маю на ўвазе спрэчкі пра тое, што горад прыдбаў і што страціў у выніку радыкальнай рэканструкцыі, здзейсненай паводле канонаў сталінскага ампіру.

У згаданы перыяд з'явіўся шырачэзны праспект імя Сталіна (цяпер праспект Незалежнасці) — сімвал горада і ўсёй Савецкай Беларусі. Транспартная плынь у горадзе стала адпавядаць праспекту толькі на мяжы 1960 — 1970 гадоў. Не думаю, што мінчане, якія па вызваленні жылі ў зямлянках, намётах і бараках, былі ў захапленні ад гэтай велічы. Але рэальна праспект аказаўся інвестыцыяй у будучыню. Для архітэктараў ён стаў свайго кшталту камертонам, вызначыўшы горадабудаўнічы маштаб, на які "настройваліся", якому мусілі адпавядаць усе больш-менш значныя новабудоўлі сталіцы. Гэта, безумоўна, набытак.

Але пры гэтым панесла страты структура горада, якая фарміравалася стагоддзямі. Прыйшоў у заняпад ягоны гістарычны цэнтр — Верхні горад. Мінск, які стагоддзямі, паводле здаровага сэнсу і побытавай логікі, разбудоўваўся вакол ракі, "адвярнуўся" ад Свісла́чы. Не генеральны план дапасоўвалі да горада, але жывую тканіну Мінска ўплішчвалі ў генплан. Я не маю намеру кагосьці вінаваціць за тагачаснае недастатковa паважлівае стаўленне да гістарычнай спадчыны. Тыя, хто памятае Мінск у 1944 годзе, распавядаюць, што, стоячы ля разбітага чыгуначнага вакзала, можна было ахапіць вокам прастору аж да таго раёна, дзе сёння новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі. Воку не было за што зачапіцца: замест горада — поле бітай цэглы. У такіх умовах думаеш не пра адраджэнне палацаў і храмаў, а найперш і ў асноўным — пра дах над галовою…

Сяргей Святліцкі. "Плошча Свабоды".

Уладзімір Стальмашонак. "Будаўніцтва Палаца прафсаюзаў".

Сяргей Святліцкі. "Дамініканскі клюштар XVIII ст.".

Мне падаецца, што найбольшую цікавасць для мінскай публікі ўяўляюць на выставе ў Галерэі Шчамялёва работы мастака-архітэктара Святліцкага. Напісаныя ягонай рукою краявіды разбуранага Мінска знаёмыя хіба малому колу гісторыкаў архітэктуры. Ягоная творчая дзейнасць у асноўным звязаная з Ленінградам. Увогуле, пасляваенная сталіца Беларусі сваім новым абліччам абавязана якраз выхаванцам ленінградскай архітэктурнай школы, якія стала атабарыліся тут. Нездарма галоўную магістраль Мінска калі-нікалі называюць "Неўскім праспектам эпохі сталінскага ампіру". Варункі маглі скласціся і так, што Святліцкі застаўся бы ў Мінску. Але атрымалася, што праца ў Беларусі была для яго толькі адным з эпізодаў біяграфіі. Тут ён быў, можна сказаць, у камандзіроўцы. У 1944 — 1945 гадах Святліцкі браў удзел у працы ўрадавай камісіі па адбудове беларускіх гарадоў. Вынікам гэтай дзейнасці сталі ягоныя цудоўныя акварэлі, якія адначасова з'яўляюцца дакладным гістарычным дакументам.

Сёння мы ўжо даспелі да таго, што гораду, асабліва сталіцы, патрэбны не толькі эфектныя новабудоўлі, якія ўвасабляюць дынаміку развіцця (з гэтым у Мінску ўсё як мае быць), але і знакі сівой даўніны. Гэта як чалавеку, які выбіўся ў вялікія людзі, не пашкодзіць мець сур'ёзны радавод (сапраўдны ці прыдуманы) і, адпаведна, шляхецкі герб. Мяркую, што справа комплекснага аднаўлення гістарычнага аблічча сталічнага Верхняга горада яшчэ не завершана. Вось тут нам і спатрэбяцца дакументальныя мастацкія сведчанні Сяргея Святліцкага.

У работах Лангбарда, Заборскага і Караля — архітэктараў, якім Мінск абавязаны манументальным абліччам свайго цэнтра, адлюстраваны не толькі сляды пакут на жывой тканіне горада, але і першыя знакі адраджэння. Гледзячы сёння на дынамічную графіку згаданых майстроў, міжволі думаеш пра тое, што архітэктар толькі тады паўнавартасны прафесіянал, калі ён яшчэ і мастак. Прадстаўленае на выставе — гэта не самастойныя творы, а рабочы матэрыял па аднаўленні і перабудове Мінска. Але па ім відаць, наколькі глыбока архітэктары тае пары ўваходзілі ў тэму, аналізавалі зыходную сітуацыю, грунтоўна рабілі праекты.

А, бадай, самы драматычны твор на гэтай выставе — малюнак, зроблены Георгіем Заборскім 24 чэрвеня 1941 года. Бамбардзіроўка. Горад гарыць. У гэтым малюнку боль і экспрэсія на ўзроўні геніяльнага Піранэзі. З гэтымі ўспамінамі архітэктар пайшоў з фронта, каб па вяртанні пабудаваць у Мінску велічны манумент Перамогі.

Гэта выстава ў нейкай ступені дае адказ на пытанне, чаму Мінск, значна саступаючы іншым сталіцам і мегаполісам па шэрагу пазіцый (турыстычнай прывабнасці, культурнай насычанасці, увасобленасці і візуалізацыі гісторыі ў рэчышчы горада…), тым не менш быў своеасаблівай мекай для архітэктараў савецкай пары. Бо такога страшнага разбурэння і такой грандыёзнай адбудовы нідзе больш не было (і дай бог, каб не было!). Вось чаму кніга "Мінск. Пасляваенны вопыт рэканструкцыі і развіцця" стаяла на паліцы ў кожнага спецыяліста горадабудаўнічай сферы. Гэта досвед, аналагаў якога ў свеце няма.

У гэтым, дарэчы, не цяжка пераканацца, калі пасля прагляду выставы выходзіш на вуліцу і бачыш наш Мінск. Адроджаны і разбудаваны.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. Леніна, 20.*
*Тэл.: 327 45 62.*
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.
Выставы:
■ Выстава **"Сучасная Беларусь вачыма мастакоў"** (творы мастакоў розных пакаленняў, розных творчых памкненняў і кірункаў) — да 11 ліпеня.
■ Выстава **"Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX–XX стагоддзяў"** (больш за 80 твораў жывапісу і графікі) — да 7 жніўня.
■ Выстава **"Рэпліка прыгожага"** (злепкі скульптуры, створаныя ў майстэрні-атэльe Луўра) — да 1 верасня.
У рамках выставы праводзіцца серыя лекцый, якія будуць чытацца на працягу ўсяго лета, кожную сераду а 17-й гадзіне.
■ Выстава Людмілы Кальмаевай **"Сфера чалавечага"** (прадстаўлены графічныя творы і жывапісныя палотны з калекцыі аўтара і Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў) — да 25 ліпеня.
■ На плошчы Свабоды праходзіць выстава партрэтаў легендарных мінчан **"Свабодны музей: гарадскія легенды"** (размешчана 20 рэпрадукцый шэдэўраў партрэтнага жывапісу з калекцыі музея) — да 30 верасня.

*Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь*

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
*г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.
■ Выстава літаграфій **"Памятныя мясціны Беларусі ў творчасці Напалеона Орды"** з фондаў музея — да 30 жніўня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
*Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — да 4 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.*
*Тэл.: 226 09 22.*
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".
Выставы:
■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — экспазіцыя незвычайных прыбораў і прылад — да 3 ліпеня.
■ Выставачны фотапраект **"Расія шматнацыянальная"** — з 8 па 24 ліпеня.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня (у дворыку музея).
■ Персанальная выстава шведскай мастачкі Людмілы Хрысцесевай **"Sustainidentity"** — да 3 ліпеня.
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"** (экспазіцыя пакажа, як змянялася грашовае абарачэнне ў Беларусі на працягу амаль дзвюх тысяч гадоў).
■ Выстава графікі часоў Першай сусветнай вайны венгерскага мастака Іштвана Задора (з фондаў Музея Яноша Дамьяніча (Венгрыя) — з 5 па 24 ліпеня.

*Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь*

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
*г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"Свет савецкіх салдацікаў"**.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.*
*Тэл.: 327 46 12.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
*г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.*
*Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.*
Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Персанальная фотавыстава Аляксандры Пяхота **"Падарожжа дадому"** — да 5 верасня.

*г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.*
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
*г. Мінск, Музычны зав., 5.*
*Тэл.: 220 26 67.*
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
■ Выстава аўтарскай лялькі Валерыі Гайшун **"Persona grata"** — да 29 ліпеня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
*г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
Выставы:
■ Выстава **"Напышлівыя кветкі"** — з 7 ліпеня да 31 жніўня.
■ Выстава **"Мастацтва папяровай выразкі"** — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
*г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.*
*Тэл.: 327 10 75.*
Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава **"Старыя героі — новы свет. Героі беларускіх казак, міфаў і легенд"** — да 28 жніўня.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
*г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.*
*Тэл: 327 11 66; 203 07 92.*
*Музей працуе:*
*пн. — выхадны,*
*аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,*
*сер. — ад 12-й да 20-й.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Сляды вайны..."** (збор прадметаў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі з фондавых калекцый музея і ўзоры рарытэтнай тэхнікі з унікальнай калекцыі Аляксея Цікунова) — да 18 ліпеня.
■ Урачыстае адкрыццё праекта **"Мабільная экспазіцыя "Вызваленне Беларусі. Верасень 1943 года — ліпень 1944 года"** (пляцоўкай для стварэння экспазіцыі паслужыла прастора перасоўнага паўпрычэпа плошчай каля 30 кв.м.) — 3 ліпеня. Пачатак у 15.00.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
*г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.*
*Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;*
*+ 37529 551 80 51,*
*+37529 190 31 49.*
*Палацавы ансамбль*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.
■ Выстава **"Час. Рэчы. Прасы"** — да 18 верасня.
*Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці*
■ Выстава **"Падарожжа"** — да 4 жніўня.
*Слуцкая брама*
■ Інсталяцыя **"Застыўшыя хвіліны цішыні"** — да 30 верасня.
*Ратуша*
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
*г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.*
*Тэл.: (8–01596) 2 82 91,*
*(8–01596) 2 82 70.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
*г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.*
*Тэл.: 294 91 96.*
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
■ У дні летніх канікул музей запрашае на праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў **"Канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэднім запісе).
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"** (праводзіцца па заяўках; маршруты могуць змяняцца ў адпаведнасці з пажаданнямі экскурсантаў).
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншавання ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
*г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.*
*Тэл.: 327 78 66.*
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*
*Філіялы Музея гісторыі горада Мінска*

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
*г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава **"Горад, які мы не бачылі. Мінск на малюнках 1940-1950-х"** (прадстаўлена больш за 50 работ выбітных дойлідаў, якія сфарміравалі вобраз сучаснага Мінска) — да 11 верасня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
*г. Мінск, пл. Свабоды, 15.*
*Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава аўтарскіх лялек **"Маленькая казка Настассі Адамовіч"** — да 31 ліпеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
*г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.*
*Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.*
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
*г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.*
*Тэл.: 285 18 86.*
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.*
Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
*г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.*
*Тэл.: 321 24 30.*
■ Выстава **"Малюю аўтабіяграфію"** Наталлі Ярмолавай (Віцебск) — да 24 ліпеня.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
*г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.*
■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамантаў"** — да 30 верасня.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
*г. Гомель, пл. Леніна, 4.*
*Тэл.: (8-0232) 74 19 11.*

*Цэнтральная частка палаца*
Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
Выставы:
■ Выстава жывапісных работ Алеся Сушы **"Беларусь, мая шыпшына..."** — да 30 ліпеня.
■ Выстава **"Скрыня Пандоры. Фантастычны свет Сяргея Парцянкова"** — да 17 ліпеня.
■ Выстава **"Ад класікі да фэнтазі"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 7 ліпеня.
■ Выстава падарункаў і каштоўных сувеніраў Гомелю і вобласці, прымеркаваная да Дня незалежнасці Рэспублікі Беларусь.
*Вежа палаца*
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.
Выставы:
■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.
■ **"Мудрая думка"** — выданні ўсходняй літаратуры другой паловы XX ст. — да 31 ліпеня.
■ **"Вытокі фэнтазі"** (адлюстраванне палеанталагічных і археалагічных артэфактаў у кнігах Дж.Толкіна і Дж.Марціна) — да 21 жніўня.
*Паўночнае крыло палаца*
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.
*Зімовы сад*
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
*г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.*
*Тэл.: (8-0232) 77 57 41.*
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.
■ Выстава **"Зброя для моцных духам"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
*г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.*
*Тэл.: (8-0154) 53 50 64.*
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

НАВАГРУДСКІ ГІСТАРЫЧНА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
*г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл.(8-01597) 2-14-70*
■ Пастаянная экспазіцыя:
**"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.
*г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.*
■ Экспазіцыя:
**"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне"**.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
*г. Мінск, вул. Казлова, 3.*
*Тэл./факс: 290 60 10.*
■ Выстава графічнага дызайну **"Ідэя!"** — да 3 ліпеня.
■ Флюарэсцэнтная арт-інсталяцыя Кацярыны Лісіцынай — да 6 ліпеня.

## ТЭАТРЫ

**ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"**
*г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.*
*Тэл./факс: 334 60 08.*
■ **5 — "Кантракт"** (камедыя) Ф. Вэбера.
■ **6 — "Кругі раю"** (дакументальная алегорыя) С.Навуменка. У рамках святочнай імпрэзы **«Святкуем Купалле разам з Купалам»**.
■ **7 — "Адамавы жарты"** (камедыя паводле твораў Ф. Аляхновіча і Л. Родзевіча) С.Навуменка.

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР**
*г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.*
*Тэл.: 200 81 26.*
■ **4 — "Блакітная камея"** (мюзікл у 2-х дзеях) К. Брэйтбурга.
■ **5 — "Мая цудоўная лэдзі"** (мюзікл у 2-х дзеях) Ф.Лоу.
■ **6 — "Бабін бунт"** (музычная камедыя ў 2-х дзеях) Я.Пцічкіна.
■ **7 — "Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана.
■ **8 — "Юнона" і "Авось"** (рок-опера) А. Рыбнікава.